НАВІНКІ

10 - 17 красавіка 2003 №10(89) Кошт свабодны



А што, калі Садам ПЕРАМОГ?



Бравыя англа-амэрыканскія салдаты штурмуюць Багдад. Войскі кааліцыі кантралююць амаль увесь цэнтар іракскай сталіцы. Насельніцтва Іраку з разуменьнем ставіцца да місіі саюзьнікаў па збаўленьні іх ад крывавай дыктатуры Садама Хусэйна й вадварэньні дэмакратыі ў іхную краіну. Паўсюль буйным цьветам расквітнела марадзёрства й рабаваньні ўрадавых будынкаў ды офісаў партыі БААС...

Прыкладна такая карцінка прадстаўляецца нам з экранаў тэлевізараў разнастайнымі каналамі. І сапраўды воляй-няволяй верыш: Садаму настаў капец! Аднак зь іншага боку закрадаецца сумнеў. Як магла 25-мільённая краіна прагнуцца пад нейкі там 150-тысячны экспэдыцыйны корпус саюзьнікаў? Ну, здаецца, ніяк... І тут на дапамогу сьпяшаецца здаровы глузд. А што, калі ўсё, што мы бачым па целеку – грандыёзная галівудзкая пастаноўка? Ну, прыгадайце, фільм «Махлярства» («Хвост, які матляе сабакам»)! Там для падтрыманьня рэйтынгу прэзыдэнта ЗША таксама была разыграная маленькая, але пераможная вайна з Албаніяй, прычым віртуальная.

Такім чынам, нас проста канкрэтна дураць! Усё, што мы бачым, гэта толькі дэкарацыі ў павільёнах кінастудыі «Каламбія пікчэз», дзе прафэсійныя статысты адпрацоўваюць дзённы заробак.

А насамрэч вайсковыя дзеяньні разьвіваюцца паводле іншых сцэнароў (калі толькі яны сапраўды маюць месца ў рэгіёне Пэрсідзкага заліву). Напрыклад, іракская армія з ходу апракінула англа-амэрыканскіх агрэсараў і перайшла ў контарнаступ, нанесшы ўдар па марыянэтках Пэнтагону. У выніку апэрацыі «Свабода Саудаўскай Аравіі» ўвесь экспэдыцыйны корпус саюзьнікаў разьбіты або здаўся ў палон, пад кантролем Садама Хусэйна апынуўся практычна ўвесь Аравійскі паўвостраў. Дзяржава Ізраіль яшчэ ўчора была скінутая ў мора. Іракскі дэсант высадзіўся ў ваколіцах Вашынгтону... А тое, што бачыце вы – хлусьня!

Ахмурэньне «зуброўкі»

Новыя вэрбовачныя тэхналёгіі апазыцыі на стар. 2

КАЛІ Б ЗАЎТРА БЫЛА ВАЙНА...

СТАР. 6,11

Погляд на нас зь Le Monde diplomatique

Стар. 4



Газэта «Навінкі» выходзіць зь лютага 1998 г. Зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце па друку Рэспублікі Беларусь 23.02.1999 г. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1272. Заснавальнікі: П.Канавальчык, А.Новікаў, А.Мазур. Галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Адрас для карэспандэнцыі: п/с 33, 220134 Менск, БЕЛАРУСЬ; E-mail: kampramat@tut.by; Юрыдычны адрас рэдакцыі: г.Менск, пр.газ.«Известия», 9-143.

Нумар падпісаны да друку 10.04.2003г., а 00.01. Тыраж 3000 экз. Надрукавана з гатовых дыяпазытываў у ПРУП «Чырвоная Зорка», г. Менск, 1-ы Загарадны зав., 3. Заказ №2385

Навінкі ў тЭстах

1. Што з 1 красавіка ў Рэспубліцы Беларусь павялічана ажно у 1,06 разы?
А) Пэнсіі
Б) Стыпендыі
В) Штрафы

2. Што абвесьціла дэпутацкая група ПП НС РБ «Эўропа наш агульны дом»?
А) Самароспуск
Б) Самазьнішчэньне
В) Самасуд

3. Які раён сталіцы па дадзеных Міністэрства Ўнутраных Спраў лідзіруе па падлеткавай злачыннасьці?
А) Маскоўскі
Б) Савецкі
В) Заводзкі

4. Амбасадар якой краіны днямі наведаў журналіста-хіміка Івашкевіча?
А) Беларусі
Б) ЗША
В) Іраку

5. Прадстаўнікі якой прафэсіі арганізавалі свой прафэсійны клюб?
А) Пчаляры
Б) Карчмары
В) Бухары

6. Пераможцам якога конкурсу стаў старшыня выканкаму Смалявіцкага раёну Мікалай Неўмяржыцкі?
А) Бюракрат году
Б) Намэнклатуршчык году
В) Букваед году

7. ГУУС Мингарвыканкаму плянуе абсталяваць увесь цэнтар гораду:
А) Відэаклюбамі
Б) Відэакамэрамі
В) Відэамагнітафонамі

8. Які эмігрант абвесьціў пра стварэньне фонду для дапамогі апазыцы?
А) А.Скаруліс
Б) В.Быкаў
В) А.Абрамовіч

9. Які канвой адпраўлены з Францыі ў Беларусь 6 красавіка?
А) Гуманітарны
Б) Вайсковы
В) Апошні

10. У Беларусі пачалася рэалізацыя праекту па аднаўленьні:
А) Лясоў
Б) Балотаў
В) СССР

11. Выпуск якой прадукцыі заводу «Мотавела» павялічаны на 70%?
А) Матацыклаў
Б) Роварaў
В) Трактароў

12. Фэстываль якой рэклямы адкрыўся на днях у Менску?
А) Дзіцячай
Б) Школьнай
В) Студэнцкай

13. Які палкоўнік абвесьціў галадоўку?
А) Кадафі
Б) Чорны
В) Буданаў

14. Дзе, паводле дадзеных разьведкі, хаваецца Садам Хусэйн?
А) У гарах
Б) У лясах
В) У балотах

Правільныя адказы: 1-Б, 2-А, 3-В, 4-Б, 5-А, 6-А, 7-Б, 8-В, 9-А, 10-Б, 11-А, 12-В, 13-В, 14-А.

Колькі каштуе пікет?

Хто аплочвае акцыі беларускай апазыцыі

Усім становіцца відавочна, што ўсё ж такі амэрыкосы дабʼюцца перамогі ў сваёй чарговай аванцюры ў Іраку. Ні ярасны супраціў садамаўскіх федаінаў, ні пратэст міжнароднай супольнасьці не змаглі перашкодзіць марскім пехацінцам захапіць Багдад і ўсталяваць «дэмакратычны» рэжым. Але якім бы крывавым ня быў рэжым і якімі б высакароднымі ні былі мэты, вайна ніколі ня можа быць ім апраўданьнем. Масавыя акцыі пацыфістаў па ўсім сьвеце служаць таму яскравым доказам. Закранулі яны і Беларусь. *Навінкі* ўжо пісалі пра тэатралізаваныя акцыі Фэдэрацыі анархістаў Беларусі ля амэрыканскай амбасады, якія разам з усім цывілізаваным сьветам пратэставалі супраць агрэсіі войск антыіракскай кааліцыі. А згодна апошняму сацыялягічнаму апытаньню, каля 90% жыхароў Беларусі не падтрымліваюць дзеяньні ЗША.

Але знайшліся-такі адмарозкі і адшчапенцы, якія на трагедыі іракскага народу намагаюцца нажыць свой кволы палітычны капітал. Усе яны прадстаўнікі так званай апазыцыі. Напрыклад, гора-спэкулянт Леванеўскі, які зараз парыць косткі на нарах і абʼяўляе галадоўкі, альбо гора-прафэсар Хадыка. А на мінулым тыдні рух ЗУБР, а дакладней тое, што ад яго засталося, правёў пікет у падтрымку дзеяньняў ЗША ў Іраку. Лёзунгі на плякатах арыгінальнасьцю не адрозьніваліся, а некаторыя нават былі прыцягнутыя за вушы з беларускай палітычнай рэчаіснасьці: «Хусейн должен уйти», «Долой тиранию», «Америка, мы с тобой». У акцыі прынялі ўдзел каля 20 чалавек, 15 зь якіх потым былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі і дастаўленыя ў пастарунак.

Падобна на тое, што ЗУБР вырашыў скарыстаць апошнюю магчымасьць, каб нагадаць грантадаўцам пра сваё існаваньне. Скончыліся халяўныя амэрыканскія грошыкі. Але невядома, як гэтае недальнабачнае рашэньне адабʼецца на будучым лёсе руху. Ва ўсялякім разе кантакты з эўрапейскімі арганізацыямі прыйдзецца прыпыніць. Ды і на будучую гіпатэтычную падтрымку айчынных выбаршчыкаў разьлічваць не прыходзіцца ●

Міміно,
ЛЁТЧЫК-ВЫПРАБАВАЛЬНІК

P.S. *У Беларусі водзіцца зубр. Калі я яго бачу, у мяне на вачах зьяўляюцца сьлёзы. Сьлёзы радасьці за сваю радзіму і за гэтую гордую жывёліну. Калі я бачыў пікет ЗУБРа, у мяне таксама зьявіліся сьлёзы, але гэта былі сьлёзы сораму і крыўды. Крыўды за тое, што некія «апазыцыянэры» сваімі ўчынкамі паганяць сьвятое імя аднаго з сымбаляў нашай роднай Сінявокай краіны.*

KampramAt@tut.by

Ахмурэньне «зуброўкі»

Або як галоўны рэдактар *Навінак* амаль не ўступіў у арганізацыю «Зубр»



Беларускую апазыцыйную грамадзкасьць даўно хваляваў г.зв. фэномэн арганізацыі «Зубр». Узьнікшы раптам зь ніадкуль, нарабіўшы досыць шуму, «зубры» зноў былі апусьціліся ў небыцьцё. Аднак, відаць, рана ставіць на іх крыж. У гэтай арганізацыі яшчэ ёсьць які-ніякі патэнцыял.

Нядаўна на рэдакцыйную скрыню kampramat@tut.by прыйшоў ліст на імя галрэда *Навінак* наступнага зьместу (па зразумелых прычынах мы ня ўказваем прозьвішча заяўленага аўтара ліста):

«Здравствуйте, господин Канавальчик!
Обращается к Вам Виктория К. Я являюсь одним из командиров ЗУБРа. Моя мечта - модельный бизнес, но очень своеобразный. Вот недавно были сделаны фотографии (правда, любительским фотоаппаратом), о публикации которых я хотела бы попросить Вас. Ваше издание публикует многие материалы, может быть и это Вам подойдет. О своем решении сообщите, пожалуйста, по этому электронному адресу. Благодарю.
Фотографии буду высылать двумя письмами, иначе большой объем будет.
Еще раз благодарю. Жду Вашего ответа.
С уважением, Виктория К.»

І фоткі, варта прызнаць, аказаліся сапраўды вельмі «своеобразные». Смазьлівая камандзірка «Зубра» фігуравала на іх ва ўсіх магчымых позах. «Звычайная парнуха», – скажаце вы. Магчыма... Аднак нас зацікавіў той эфэкт, які аказалі фоткі на самога галоўнага рэдактара ды ўсю мужчынскую частку калектыву рэдакцыі. Глянуўшы на прывабнае дзявочае цела, ўсе адразу хацелі былі кінуцца шукаць нумары «зуброўскіх» пэйджэраў на сьценах і платах гораду, падпісаных імем Вікторыя. Выратавала ад пагрозы ўступленьня рэдактара *Навінак* і Ко ў «зубры» толькі апэратыўна набытая бутэлька «Зуброўкі» ды тэрміновае стрыптыз-шоў, выкананае сіламі жаночай часткі рэдакцыі.

Аналіз гэтага інцыдэнту яскрава даводзіць, што «зубры» ня сьпяць у шапку, а абкатваюць новыя тэхналёгіі па вэрбоўцы маладых людзей у свае злавесныя структуры. І калі на такую нажыўку павёўся нават загартаваны ў амурных справах навінкаўскі галрэд, то што ўжо казаць пра падлеткаў, што толькі-толькі ўступаюць у пэрыяд полавага сасьпяваньня? Так што, зь вясновымі гармонамі варта чакаць і чарговай «зубровай» эрэкцыі ●

Рэдакцыя

«Зубры» вынайшлі новую форму вэрбоўкі: замест учорашняга «Он должен уйти» сёньня актуальна «Иди ко мне, милый»

Настальгія замучыла

«При слове «Бобруйск» общество блаженно застонало: Бобруйск считался высококультурным местом».

У гэтым годзе дзьве тысячы амэрыканскіх габрэяў зьбіраюцца зьдзейсьніць паломніцтва ў Беларусь, пераважна Валожын, Мір, Радунь, Слонім, Віцебск, Наваградак ды й іншыя культурныя месцы. Вось толькі горад Бабруйск дзіўным чынам выпаў з гэтага сьпісу. У сваю чаргу арганізатары хаджу сьцьвярджаюць, што ў Беларусі «былі і захаваліся сынагогі, школы па падрыхтоўцы праведнікаў, а таксама магілы знакамітых рабінаў», і таму наша краіна мае вялікае значэньне для сусьветнага габрэйства.

«Вядома ж! – скажа які-небудзь філёзаф-антысэміт. – Большасьць з эмігрантаў, якія зьехалі з былой БССР, скалацілі тут першы капітал, займаючыся спэкуляцыямі на садавінагародніннавых базах ды ў крамах». А потым пачне падбухторваць моладзь ісьці на вакзал сустракаць ды адпраўляць іх назад. Гэтак і да габрэйскіх пагромаў недалёка.

А што, калі паглядзець на дадзены факт зь іншага боку. Як вядома, кожны турыст з далёкага замежжа за час знаходжаньня на тэрыторыі Беларусі пакідае ў дзяржаўную кішэню каля 700-800. Такім чынам гэткае паломніцтва будзе спрыяць разьвіцьцю турыстычнага бізнэсу ў Беларусі і прынясе не малы дадатак да бюджэту. Так што гарадзкім уладам вышэй пералічаных гарадоў трэба хутчэй наладжваць адпаведную інфраструктуру ды хлебам-сольлю сустракаць дарагіх гасьцей.

Я ганаруся

Хай сьвішча бес, песьню зацягне ўсявышні:
Беларусь паступае ў касьмічаскі клюб.
У краіне сваёй мы нічога ня зьнішчым,
Сьвяткуем навуковы hi-tech шлюб.

Свой спадарожнік мы пабудуем,
У нябёсы адправім куб з мэталу.
Хай скрозь прасторы радыёхваляў
Гучна грае песьня цымбалаў!

Космас – ня толькі ўгору надоі,
Ня толькі калгасьнікам плюс.
Хай наш першынец малы
Адновіць былы Савецкі Саюз.

Гэта, як зубр, як МАЗ, БелАЗ як,
Радзімы каханай твар
Зараз будзе назаўсёды ў нас
Супэрсусьветны беларус-гаспадар!

Хай у недругаў-негадзяяў-фашыстаў
Душу запоўніць зайздрасьць і горыч.
Наш першы спадарожнік мы назавем
Проста ад сэрца «Рыгорыч».

Ярыла Пшанічны

Дзень КАСМАНАЎТЫКІ




Гігантаманія невылечная, асабліва на дзяржаўным узроўні. Спачатку былі лядовыя палацы, потым прыйшла пара Нацыянальнай бібліятэкі. І вось нарэшце чарга дайшла для сьвятой для кожнага чалавека рэчы – космасу. Напярэдадні Дня касманаўтыкі, які шырока адзначаецца на прасторах былога СССР, Аляксандар Лукашэнка правёў нараду з удзелам беларускіх і расейскіх навукоўцаў, вынікам якой стала сэнсацыйная навіна: Беларусь будзе мець свой нацыянальны касьмічны спадарожнік!!!

Па словах бацькі «работа з касьмічнымі тэхналёгіямі – гэта ня толькі прэстыж дзяржавы, прыкмета яго высокага развіцьця. Яна мае істотную ролю і ў сацыяльнаэканамічным разьвіцьці любой краіны, забесьпячэньні яе жыцьцядзейнасьці, умацаваньні абараназдольнасьці і бясьпекі. Стварэньне штучнага спадарожніка Зямлі мае важнае народна-гаспадарчае значэньне, а таксама немалаважныя сацыяльныя і палітычныя аспэкты».

Калі першы досьвед будзе ўдачным, можна па аналёгіі разьвіваць сваю ўласную касьмічную праграму. Спачатку Белка і Стрэлка, потым першы чалавек, потым выхад у адкрыты космас, а магчыма, і высадка на Луну. Вянцом стане прысутнасьць беларускага касманаўта разам з расейскім і амэрыканскім на міжнароднай касьмічнай станцыі, што стане замыкаючым зьвяном у працэсе інтэграцыі ●

Юры Гагарын

Наш паравоз ляціць упярод!



Незвычайны спосаб здабываньня грошай знайшло кіраўніцтва Беларускай чыгункі. У рамках праграмы разьвіцьця турызму рэалізаваны праект турыстычнага рэтра-цягніка, на якім аматары вандровак змогуць зрабіць экскурсійныя туры па Беларусі. Цуда-цягнік будзе сфармаваны ўжо ў канцы красавіка. Спытаецеся, чаму ж цуда. Справа ў тым, што спэцыялісты лакаматыўных дэпо Бярэсьця і Крычава адрэстаўравалі два цягнікі выпуску 50-х гадоў. Да гэтых паравозаў і будуць прычапляцца сучасныя вагоны. Хаця «сучасныя» – вельмі слаба сказана. Вагоны будуць абсталяваныя па апошнім слове навукі і тэхнікі. Усе яны будуць выключна мяккімі. На саставу будзе два вагоны-рэстараны, а таксама спэцвагон, у якім можна будзе скарыстацца душам, цырульняй і іншымі бытавымі паслугамі. І ўся гэтая прыгажосьць хутка закалясіць па дарогах Беларусі. Так што будучы турыст можа не хваляваацца за свой камфорт і спакой. Такія меры канешне ўражваюць. А што, шаноўнае спадарства, прыкажаце рабіць шэраговым беларускім пасажырам, якія штодзень вымушаныя езьдзіць на звычайных цягніках. Узяць, напрыклад, славутую кругасьветку №660 Менск-Бярэсьце зь яе драўлянымі агульнымі вагонамі і заблёванымі тамбурамі, якія ў дарозе знаходзіцца каля дванаццаці гадзін. Пасьля такой паездкі хочацца ўсё жыцьцё стопам езьдзіць. Вось дзе сапраўдны турыстычны экстрым. Іншаземцам абавязкова спадабаецца ●

Аня Карэніна

Губіць людзей ня піва

Цяжкае пахмельле расейскіх піваўараў



Колькі людзей, столькі меркаваньняў – гаворыць старажытная прымаўка. Кожны чалавек адданы свайму любімаму напою. Хтосьці гарэлку хлешча, хтосьці бырла па пад'ездах жлукціць, а хтосьці па-інцілягентнаму піва з ракамі смокча. Спынімся падрабязьней на піве. У нас яно падразьдзяляецца на сваё, айчыннае і на замежнае, пераважна расейскае. Дык вось, аматарам апошняга ў бліжэйшы час прыйдзецца не салодка. З 1 красавіка Беларусь увяла дадатковыя меры па ўдасканаленьню ўмоваў экспарту расейскага піва. Згодна зь імі затраты расейскіх кампаній на пастаўку піва сталі непараўнальна вялікімі. А таму адразу дзьве канторы – «Афанасий-пиво» і «Балтика» часова прыпынілі пастаўкі сваёй прадукцыі ў Беларусь.

Каторы ўжо раз беларускі ўрад кідае «Балтику» разам зь яе кіраўніком Тэймуразам Балоевым. Вядома ж, гэта зроблена ў інтарэсах нацыянальных вытворцаў, чыя прадукцыя, на думку нашай рэдакцыі, значна лепшая па сваіх смакавых якасьцях, чым расейская пад'ёпка. Дзе яшчэ вы знойдзеце непастэрызаваную «Аліварыю» і як сьляза чыстую «Крыніцу»?

Але сутнасьць трагедыі зусім ня ў смаку. Справа значна глыбей. «Зри в корень» - як казала група аўтараў канца XIX стагодзьдзя, што хавалася за псэўданімам Казьма Пруткоў. Некалькі дзён таму былі падведзеныя вынікі конкурсу «Чалавек году – выбар году». У намінацыі «Піва №1 2002 году» перамогу атрымала менавіта «Балтика». Невядома, канешне, хто яе выбіраў, можа, сам Балоеў. Але переможца мае права зьмяшчаць на этыкетцы свайго прадукту надпіс «Товар/Услуга №1» у рэклямных мэтах. Толькі якая карысьць ад гэтай этыкеткі, калі тавар адсутнічае на рынку. Да гэтай пары застаецца невядомым, хто ж заказаў «Балтику» ●

Іван Таранаў

ФОтатЫдзень

Калі б фотка магла гаварыць



Нацыянальная зборная Беларусі па тэнісу выйграла адзін з этапаў кубку Дэвіса ў зборнай Зімбабвэ, дзе, як вядома, кіруе злосны дыктатар Мугабэ. Як заўсёды, выдатна праявілі сябе лідэры нашай каманды Мірны і Валчкоў. Наступнай будзе зборная Нямеччыны.



А. Лукашэнка наведаў 558-ы баранавіцкі авіярамонтны завод. У ходзе паездкі ён заявіў, што Беларусь не зьбіраецца ні з кім ваяваць, але «порах трэба трымаць сухім». Таксама заплянаваныя вучэньні пад назвай «Чыстае неба».



Незвычайна позьнія маразы са сьнегам сталі поўнай нечаканасьсю для кіраўнікоў калгасаў, якія ўжо пачалі сяўбу датэрмінова. Нягледзячы на папярэджаньні сыноптыкаў, тоны каштоўнага насеньня былі незваротна страчаныя на вясновых палях.



Аляксандар Рыгорыч падпісаў чарговы ўказ «Аб прызыве на тэрміновую службу». Хутка самыя здаровыя духі зноў папоўняць шэрагі абаронцаў Айчыны.



У сталічным выставачным цэнтры прайшла чарговая міжнародная выстава «Бістро, піва, віны, напоі». Некаторым шчасьлівым наведнікам удалося на халяву хлябнуць дарагіх замежных чарнілаў альбо айчыннага беларускага піва.

Інтэграцыя, раздражняльнасьць і дэзінтэграцыя

LE MONDE diplomatique

Прыстасаваньне да ўмоваў Эўрапейскага Саюзу закранае ня толькі новых сябраў ЭС, аднак і іхных суседзяў на Ўсходзе. Для Ўкраіны і Беларусі гэта азначае канкрэтныя карэнныя перамены. Бо тут, пасьля адкрыцьця савецкай зьнешняй мяжы, дробны гандаль з Польшчай стаў эканамічным маторам рэгіянальнага эканамічнага разьвіцьця. На памежным пераходзе Медыка на поўдні Польшчы трыста мэтраў раздзяляе польскіх мытнікаў ад іхных украінскіх калегаў. У гэты дзень дождж ідзе ракой і вельмі халодна. Аднак, як заўсёды, сотні ўкраінцаў стаяць у чарзе на пераход. Старонкі іхных пашпартоў пакрытыя штампамі польскіх памежнікаў.

Штодня 5000 чалавек пераходзяць гэты пункт. 80% зь іх – украінцы, «чаўнакі». Пасьля 1991 году, калі мяжа паміж СССР і Польшчай была адчыненая, сотні тысячаў украінцаў спэцыялізуюцца на дробным гандлі з Польшчай. Самыя папулярныя тавары: гарэлка і цыгарэты, якія спрабуюць правезьці кантрабандай. Нягледзячы на нелегальны аспэкт гандлю, абодва памежныя рэгіёны Ўкраіны і Польшчы жывуць з гэтага. Пераходны пункт Медыка зьвязвае суседнія гарады Пшэмысль і Львоў. Львоўскі журналіст Віктар Хальштынскі спэцыялізуецца на тэме «чаўнакоў»: «чаўнакі маюць сёньня маргінальнае значэньне. Памежны гандаль базуецца на рэгіянальных прадпрыемствах, якія стварылі чалнакі першай генэрацыі: прадукты, мэбля, вокны... Гэтыя дробныя структуры карыстаюцца нераспрацаваным заканадаўствам і амаль ня плацяць падаткаў. На шэрую эканоміку прыходзіцца 80% памежнага гандлю, астатнія 20% выпадаюць на транснацыянальныя фірмы і 269 польска-ўкраінскіх ТАА, чый абарот у 2001 годзе складаў 1,5 млрд. эўра. Увядзеньне візавага рэжыму паграджае якраз бізнэсу «шэрых».

З пачаткам перагавораў аб уступленьні ў ЭС, якія пачаліся ў сьнежні ў Брусэлі, ад палякаў катэгарычна патрабавалі ўвядзеньня візаў для іхных усходніх суседзяў. Мэта эўрапейцаў: перастрахавацца ад прытокаў нелегалаў. Пасьля ўвядзеньня ў ліпені 2003 г. візаў маштабы дробнага гандлю, зь якога жывуць каля 40% насельніцтва памежных рэгіёнаў, радыкальна паменьшацца. Прагноз Віктара Хальшчынкага: як мінімум на дзьве трэці.

Анджэй Жыромскі, рэкламіст з Пшэмысля: «Новыя правілы на мяжы – гэта трагедыя. Акрамя сацыяльных і эканамічных наступстваў, яны будуць мець псыхалягічныя. На ўсходзе настрої супраць Захаду. Падчас пашырэньня ЭС усе кажуць пра інтэграцыю, а на самой справе мова ідзе пра дэзінтэграцыю».

Наколькі апраўданы гэты пэсымізм?

У Польшчы рабілі ўсё, каб адцягнуць увядзеньне візавых правілаў. Гэтага нельга сказаць пра іншыя краіны-кандыдаты. Славакія ўвяла візы з усходнім суседам Украінай з 28 чэрвеня 2000 г. У выніку колькасьць украінцаў-візіцёраў скарацілася на чвэрць. Славацкая віза каштуе 30 даляраў. Гэта трэць сярэдняга месячнага прыбытку на Ўкраіне. Увосені 2001 г. прыкладу Славакіі пасьледвала Балгарыя.


Дарагі адпачынак

«Раней шмат украінцаў адпачывалі ў Балгарыі, – скардзіцца Віктар Хальштынскі. Я таксама, аднак лічыце самі. Віза ў Балгарыю каштуе 20 даляраў. Яшчэ 40 каштуе падарожжа ў Кіеў, дзе знаходзіцца балгарскі кансулат. Такім чынам – 60 даляраў. Ведаеце, колькі я апошні раз заплаціў за адпачынак у сярэднім гатэлі ў Балгарыі? 80 даляраў. Кошты на падарожжа ў Балгарыю вырасьлі ў два разы. Натуральна, я не зьбіраюся болей туды ехаць».

Увядзеньне візы разглядаецца, як крок назад. Яна супярэчыць намаганьням як палякаў, гэтак і ўкраінцаў, якія пасьля стагодзьдзяў недаверу і нянавісьці зноў будуюць добрасуседзкія адносіны. Станіслаў Штэпьен узначальвае эканамічны дасьледчы інстытут у Пшэмыслe: «Калі мяжу адчынілі, зноў запанавалі старыя стэрэатыпы. Здавалася, што сёньняшнія дзяржаўныя межы будуць ізноў пастаўленыя пад пытаньне. Аднак мы здолелі перааДолець супярэчнасьці. Цяпер людзі маюць пачуцьцё, што новая мяжа стане сьцяной. У асяродзьдзі ўсходніх палякаў гэта павялічвае скептычныя настроі да ЭС».

Апошняе апытаньне сьведчыць, што палякі на Захадзе краіны больш пазытыўней ставяцца да сяброўства Польшчы ў ЭС, чым усходнія палякі. У Памэраніі за ўваход у ЭС выступае 79% мясцовага насельніцтва, а на мяжы зь Беларусьсю і Ўкраінай – толькі 38%. Адпаведна апошнім апытаньням, стаўленьне палякаў да ўсходніх суседзяў за апошнія гады значна палепшылася. Калі ў 1992 г. украінцаў не любілі 65%, а беларусаў 47%, то зараз падобныя настроі маюць 48% і 36% адпаведна.

Андрэй Паўлышын, выдавец львоўскага незалежнага часопісу Джыга (www.ji-magazine.lviv.ua): «Нашыя стасункі падобныя на стасункі францызаў і немцаў. Увядзеньне візаў ускладніць кантакты. Мы нясупраць сяброўства Польшчы ў ЭС. Мы толькі пытаем: што будзе з намі? Сёньня ЭС маршыруе на Ўсход не без санкцыяў Расеі. З Украіны робяць васала Масквы, і ўсе



задаволеныя. Нам страшна, што ў якасьці рэакцыі на пашырэньне ЭС Украіна пойдзе на Ўсход. Хто ведае, ці не аднавіць увядзеньне візаў стары недавер паміж Усходам і Захадам?»

Сапраўды, Украіна і Беларусь становяцца больш залежнымі ад адносінаў паміж ЭС і Расеяй. Гэта даказвае зацьверджаная Эўрасаветам у лістападзе 2002 г. ініцыятыва «Добрае суседзтва». Галоўнай мэтай палітыкі на Ўсходзе прагалошаная «адбудова добрага суседзтва на аснове агульных эканамічных і палітычных каштоўнасьцяў». Аднак пры гэтым дабаўлена, што «гэтая ініцыятыва ёсьць прявай намеру інтэнсыфіцыраваць супрацоўніцтва з расейкай Фэдэрацыяй, якая зьяўляецца найважнейшым партнэрам ЭС».

Ценявы бок новай сьцэны

Рамано Продзі напярэдадні саміта ў Капэнгагене заявіў, што ня бачыць для сяброўства Ўкраіны ў ЭС ніякага грунту. «Мы павінныя дыскутаваць кандыдатуры кандыдатаў».

Адным словам, «новым суседзям» няма чаго рабіць у складзе ЭС. На першы плян выходзіць праблема забесьпячэньня бясьпекі мяжы. З 1997 г. Варшава атрымала 55 мільёнаў эўра на ўзмацненьне мяжы. У Капэнгагене ёй абяцана яшчэ 280 мільёнаў, каб мадэрнізаваць 1200 кілямэтраў усходняй мяжы. Толькі пасьля гэтага яна можа стаць сябрам Шэнгенскай зоны. Сёньня зразумела, што Польшча ня здольная выканаць умовы да 1 мая 2004 г. Як доўга прыйдзецца чакаць? «Мы ня ведаем, – прызнаецца журналістка Софія Ануфрыева, – мова ідзе пра 3-5 гадоў. Валоданьне польскай візай ня будзе даваць права на падарожжа ў краіны Шэнгену. Уявіце, што я еду ў Бэрлін і вымушаная правесьці пару дзён у Варшаве. Мне спатрэбіцца дзьве візы. Страшна падумаць, колькі гэта будзе каштаваць». Каб аблегчыць працэдуру, Польшча думае пра танныя і шматразовыя візы.

Акрамя таго незразумелае пытаньне з інфраструктурай выдачы візаў. «Польскі кансулат ня здольны выдаваць 13 мільёнаў візаў штогод», – мяркуе Софія Ануфрыева.

На думку шматлікіх аналітыкаў, увядзеньне візаў бумэрангам выкліча рост карупцыі. Леон Тарасевіч жыве за 10 кілямэтраў ад беларускай мяжы ў вёсцы Валілы. Вядомы мастак аналізуе адносіны паміж суседнімі краінамі: «Дробная карупцыя натуральна зьнікне. Верагодна, не спатрэбіцца болей даваць хабар, каб цябе не абшукалі або дазволілі правезьці тры пляшкі гарэлкі. Аднак, чым больш жорсткая мяжа, тым большая карупцыя. Мафія ня будзе хістацца, калі будзе трэба праплаціць вялікія грошы».

У Беларусі пачуцьцё ізаляцыі вельмі моцнае, таму што ЭС патрабуе спэцыяльных санкцыяў супраць рэжыму аўтарытарнага прэзыдэнта Лукашэнкі. Адначасова адсутнічаюць умовы для збліжэньня паміж Масквой і Менскам. Здаецца, Пуцін ня здольны напоўніць расейска-беларускі саюз канкрэтным кантэкстам. Расейкі прэзыдэнт выкарыстоўвае ізаляцыю Лукашэнкі, каб узмацніць свой уплыў.

У Гародні дырэктар школы кажа: «Паколькі ЭС нас не жадае, Саюз з Расеяй быў бы не такой дрэннай ідэяй. Аднак Масква разумее гэты саюз толькі ў форме інтэграцыі Беларусі ў склад Расейскай Фэдэрацыі. Беларусы гэтага не жадаюць».

Яшчэ ў 1993 г. тагачасны міністар замежных справаў РБ П.Краўчанка быў поўны аптымізму: «Праз 10-12 гадоў у Эўропе будуць існаваць два блокі, якія будуць збліжацца паміж сабою – эўрапейскае грамадзтва і аб'яднаньне з удзелам Расеі, Беларусі, Украіны і Казахстану. Да 2003 году мы вырашым усе праблемы і будзем гатовыя да стварэньня агульнаэўрапейскага рынку». Дзесяць гадоў пазьней гэтая думка застаецца ўтопіяй ●

Гі П'ер Шамэт

(Le Monde diplomatique)

Эра геапалітычнага мачо

Нашыя дэмакраты лічаць Буша-юніора – выдатным палітыкам сучаснасьці.

Амэрыканскія культуролягі – гамункулусам белых гопнікаў.

Інтэрвэнцыя ў Ірак – гэта больш чым геапалітычны акт у барацьбе ЗША за нафтавую гегемонію. Яна прынесла маніфэстацыю новых культурных пазыцыяў, якія карэнным чынам зьмяняюць стыль сучаснага палітыка. Прасачыць гэта можна на эвалюцыі фантазій амэрыканскага спажыўца, люстэрка якіх – прадукты кіно, ТВ і радыё.

Аналізуючы вобразы, якія дамінавалі ў масавай культуры да 9-11 і пасьля 9-11, культуролягі прыходзяць да рэзюмэ: новым культурным абразом ЗША (і як вынік, палітычным) ізноў стаў мачо.

Яшчэ ўчора гэта здавалася неверагодным: зь сярэдзіны 80-ых, калі фэміністкі падаліся ў палітыку, мачо паступоваператварыліся ў маргіналаў. Спробы прадэманстраваць супэрмужчынскасьць лічыліся праявамі «калхазанства» або «сэксуальнай помсты» жанчынам за свае комплексы. Архетыпам «сэксуальнага мсьціўцы» мужчыны стаў кінагерой Майкла Дугласа (Fatal Attraction (1987), Disclosure (1994)).

Галоўны ўдар па фэмінізму нанес хіп-хоп, які раскруціў тып агрэсіўнага сэксуальна заклапочанага гангстэра з чорнай камуны. Ім захапіліся ня толькі чорнаскурыя тынэйджэры, але з



З трыюмфам рэп-культуры ў палітыцы асновы міжатлянтычнага дыялёгу набудуць новыя далягляды

часам і іхныя аднагодкі зь белых прыгарадаў. Як ня дзіўна, шмат сяброваk падыгралі сваім бойфрэндам, пагадзіўшыся стаць «шлюхамі» і «дзіркамі». Хутчэй за ўсё, гэта было гульнёй, модай, cool.

Рынак хіп-хопу падрыхтаваў глебу для новай мужчынскай ідэнтычнасьці, якая наступіла пасьля 9-11. Зразумела, пасьля 9-11 ня ўпэўненыя янкі патрабавалі героя-абаронцу. Але дзіўная рэч: фігура героя, якая была запатрабаваная пасьля Вялікай Дэпрэсіі, карэнным чынам адрозьніваецца ад сёньняшняга супэрстара. Поп-ідалямі фільмаў 30-ых былі дробныя адвакаты, дэтэктывы і вайсковыя вэтэраны з сваімі сындромамі. У 2003 г. міністар бясьпекі адміністрацыі Буша Рамсфэлд, падобны да аблезлага выкладчыка матэматыкі, уваходзіць у сьпіс найбольш сэксуальных мужчын Амэрыкі. У герояў 30-ых быў таксама мужчынскі нарцысізм, аднак іхным галоўным ворагам была несправядлівая сыстэма. Сёньня мачо-палітыкі здымае свае сэксуальныя комплексы ў геапалітычных праектах, што адпавядае філязофіі белых гангаў, якія варожаць з суседзкімі бандамі, замест таго, каб мачыць паліцэйскіх.

Мілітарызм і антыфэмінізм рэпэраў і рэспубліканскіх кансэрватараў дзіўным чынам наклаліся адзін на аднога, нарадзіўшы новую палітычную культуру Амэрыкі. Калі яна будзе пашыраная на астані сьвет – на тое яна і глябалізацыя – нас чакаюць абсалютна фантастычныя рэчы ●

Gott mit uns

У польскіх жаўнэраў у Іраку замест бронежылетаў Боскае благаслаўленьне

На дапамогу амэрыканцам, брытанцам і аўстралійцам у Ірак адправілася 200 бравых польскіх хлопцаў. Вядомая польская газэта *Nie* задалася пытаньнем: што дапаможа польскім жаўнерам, якія змагаюцца супраць Хусэйна, несьці у гушчу іракскіх масаў ідэалы дэмакратыі? Адказ, натуральна, напрошваецца сам сабой: вядома ж, Бог!

Заданьне абмежаванага польскага кантынгенту ў Іраку – ня толькі раззброіць Хусэйна, ня толькі інтэгравацца з НАТАўскімі структурамі, ня толькі паказаць усяму сьвету, што Польшча зьяўляецца верным саюзьнікам Захаду, аднак разам з прадстаўнікамі іншых хрысьціянскіх армій усьлавіць Бога. А каб польскія салдаты кожную хвіліну маглі адчуць сябе неад'емнай часткай цывілізацыйнага праекту пад назвай «Вайна», кожны з хлопцаў на халяву артымаў «Польска-ангельскі малітоўнік салдата» («A Polish-English prayer book for soldiers»). Праўда, незразумела, чаму міжцывілізацыйны мовай камунікацыі з Богам зьяўляецца нават не лацінская мова, а ангельская. Аднак гэта ўжо дэталі.

Пачынаецца малітоўнік стандартнай малітвай: «У імя Айца і Сына і Сьвятога Духа» – In the name of the Father, and of the Son, and of the Holy Sprit. Пасьля такога разугрэву можна разам з партнэрам па антысадамаўскай кааліцыі прамовіць «Малітву маракоў» («Sailors Prayer») або «Малітву лётчыкаў» («Air corps prayer»), можна прачытаць малітву за «расчараваных» – «Prayer for Depressed», або малітву за самазабойцаў – «Prayer for Suicide». Нажаль у зборніку няма малітвы за Буша малодшага, аднак замест гэтага можна прачытаць малітву «За абаронцаў міру» («Prayer for Peace makers») або, хто жадае, «Малітву за блажэнных» – «The Divine Praises». На вайне як на вайне, усё можа здарыцца. А польскі салдат у небясьпечным становішчы заўсёды патрабуе пайднаньня з касьцёлам. Гэта можна зрабіць шляхам спавяданьня грахоў – confession of sins. У раздаваным польскім салдатам малітоўніку пералічаныя і перакладзеныя на ангельскую найбольш клясычныя грахі: пралюбадзейства, забойства і г.д. Аднак тут газэта *Nie* зьвяртае ўвагу чытачоў на відавочныя недапрацоўкі ў складаньні малітоўніку: бракуе найбольш папулярных сярод польскіх жаўнераў грахоў і іх перакладу на ангельскі. Бо бяз гэтага немагчыма і атрымаць індульгенцыю на забойства. Каб ліквідаваць гэты прабел у малітоўніку, *Nie* прапанавала ўключыць у кнігу наступныя важныя для жаўнераў Рэчы Паспалітай рэчы:

«Я выкрадаў гранаты і амуніцыю з складоў, а потым прадаваў яе праз інтэрнэт і на рынку». – I was steeling hand-grenades and cartridges from the store and then I was selling them via Internet and on the market.

«Каюся, сьвяты айцец, што некалькі месяцаў запар я выносіў з карабля мазут у бляшанках». – For months I've been caring our cans full of petard from the ship.

«Я дапамог «братве» сьцібрыць 25 пісталетаў». – I helped gangsters in stealing 25 guns.

«Я зьдзекваўся з суседа па казарме, што прыносіла мне вялікае задавальненьне». – I've been tyrannizing my colleagues, which made me very satisfied.

«Я біў саслужыўца па башцы жалезнай палкай». – I was beating my colleague's head with the metal bar.

Цяпер можна быць спакойнымі. Польскія салдаты атрымаюць поўнае адпушчэньне грахоў і пачуюць ад капэлана запаветныя словы: «Госпад адпускае табе ўсе твае грахі. Ідзі зь мірам». – The Lord has freed you from you sins. Go in peace.

Варта зазначыць, што слова «мір» разумеецца ў значэньні «спакой, стан адсутнасьці псыхічнай канфрантацыі, раўнавага духа і помыслаў». Цяпер можна забіваць ●

пані Моніка,
ваенны экспэрт

Гласарый вайны

Падзеі ў Іраку выклікаў рэнэсанс характэрнага для часоў «халоднай вайны» дзіўнага журналісцкага жаргону. Новы слэнг павінен камуфляваць сапраўдныя падзеі адпаведна ідэалягічнай замове. Пачынаючым журналістам, якіх даслалі пісаць камэнтары да вайнушкі ў заліве, раім не пісаць адсябяціну. Перш за ўсё трэба вывучыць гэты невялікі гласарый найбольш ужываных тэрмінаў, якія ілюструюць падзеі на фронце сутыкненьняў цывілізацыяў. У залежнасьці, дзе вы працуеце – незалежных або дзяржаўных СМІ – вы можаце ўжываць новыя фразэалягізмы і гарантаваць сабе шалёны кар'ерны рост.



1. Сьлёзы радасьці на твары іракскага хлопчыка: нарэшце прыйшлі нашыя – амэрыканскія вызваліцелі!
2. Вось што нясе народу Ірака буржуазная дэмакратыя і адсутнасць акцызаў для расейскіх півавараў.

Гласарый прадстаўніка афіцыйных мэдыяў:

Няўдалы бліцкрыг, палігон для абкаткі 3-ай сусьветнай вайны, выклік сусьветнай грамадзкасьці, гуманітарная катастрофа – вайна ў Іраку.
Горстка сатэлітаў – краіны, што падтрымалі ЗША ў вайне з Іракам.
Разбурэньне сацыяльнай і эканамічнай інфраструктуры – наступ сілаў кааліцыі.
Акупацыйныя войскі – часткі ЗША і Вялікабрытаніі.
Заява, ад якой сьмярдзіць цынічнасьцю – камюніке прадстаўніка амэрыканскай адміністрацыі.
Наданьне імпульса антывайсковаму руху, прынцыповая пазыцыя – заява прэзыдэнта РБ.
Беспасьпяховы штурм – блякада Багдаду.
Фаза стратэгічнай паўзы – адступленьне іракскіх войскаў.
Вайсковыя злачынствы – усё, што робяць войскі антысадамаўскай кааліцыі.

Гласарый прадстаўніка дэмакратычных СМІ:

Вызваленьне Іраку, праваабарончая акцыя, барацьба за свабоду іракскага народу, вайна супраць тыраніі – вайна ў Іраку.
Асымэтрычная вайна – тэрмін, які заклікаы апісаць тэхналягічную нераўнавагу паміж сіламі антысадамаўскай кааліцыі і іракскай арміі.
Вызвольныя войскі – салдаты антыіракскай кааліцыі.
Спадарожныя разбурэньні – ніколі нездагадаецеся, што гэты эўфэмізм значыць ахвяры сярод грамадзянскіх асобаў, забітых падчас вайны.
Чакаючыя (expectant) – папулярны тэрмін, які ўжываюць на брыфінгах прэс-цэнтру штабу амэрыканскай арміі ў Катары. Азначае грамадзянскіх асобаў, у якіх стралялі, аднак да канца не забілі, іншымі словамі цяжка і сьмяротна параненых. Вельмі зручная слова.
Рашучасьць абараняць чалавечую годнасьць і свабоду – пазыцыя амэрыканскага прэзыдэнта.
Злачынны рэжым – грамадзкапалітычны лад Арабскай Рэспублікі Ірак.
Маргіналы, што дэманстравалі пад сьценамі амэрыканскай амбасады сваю падтрымку Хусэйна і якіх ніхто не чапае – пацыфісты.
Плявок у твар міжнароднай грамадзкасьці – заява прэзыдэнта РБ.
Краіна, чые жаўнеры сёньня ахвяруюць уласнымі жыцьцямі за свабоду народаў Іраку – натуральна, ня Папуа-Новая Гвінэя. Гэта ЗША.
Вайсковыя злачынствы – усё, што робіць армія Іраку.

Як бачым, усё проста. Галоўнае ведаць, хто башляе тваіму СМІ і не памыліцца пры падрыхтоўцы матэрыялу. У якасьці трэнінгу прапануем будучым Эрэнбургам, Шустэрам і Дарэнкам вызначыць, які подпіс пасуе пад дадзеную ілюстрацыю для Саўбелкі ●

Іван Іваныч,
Будуэн дэ Куртэнэ

Гаворыць Скаруліс...



Агляд айчыннай аналітыкі беларускім палітэмігрантам са Швайцарыі і Бэльгіі

А нашыя калюмністы й ня думалі драмаціць! Ані на хвіліну! Паглядзеў на ціхае-мірнае бэльгійскае жыцьцё: іх, бэльгійцаў, і не цікавяць сусьветныя праблемы. Атрымаў пошту, і вось што пішуць нашы экспэрты па сусьветным заняпадзе, дэкадэнты грамадзкага мысьленьня і віртуозы афарыстычнага прысуду цывілізацыі.

Канстанцін Скуратовіч у *Белорусском рынке* скардзіцца на прэзыдэнцкія прыдумкі пра «ідэалёгію» – тут, у Бэльгіі нікому нічога падобнага і ў сьне ня бачылася:



А гэта пра тое, што новая ідэалёгія, якой паграгжае беларускі прэзыдэнт заменіць устойлівую формулёўку, якая ў новай рэдакцыі загучыць так: «Я начальнік – я дурак, ты начальнік – ты дурак».

Неразьменны ні на якія эўрацэнты калюмніст *Белорусской газеты* Грыцанаў А.А. (Паважаны чалавек! Хто б пагадзіўся штотыдзень выдаваць такія газэтныя пэрлы) у сваёй асобе злучае і начальніка сваёй калонкі, і бацюшку з царквы Фрола і Лаўра. Знаёмы філёзаф з Уганды казаў, што ў Гегеля ёсьць пасаж пра тое, што газэта ў буржуазным грамадзтве выконвае ролю царкоўнай пропаведзі ў Сярэднявеччы:



Што ж... Многая лета мітрапаліту Аляксандру Грыцанаву! У нумары за 7 красавіка калюмніста Беларускай газэты ізноў панесла на рэлігійную тэму. Хаця і заносіла часам у накірунку самым супрацьлеглым і фрывольным: «Поиск единого целого с Россией привел к тому, что Минск «опускают» как тогда, когда Россию ўекочут за ухом, так і – тем более тогда, когда ее геополитически жестко воспитывают...»

І ўжо наступны пасаж прысьвечаны знакамітаму рэлігійнаму дзеячу: «Так во внешней политике белорусское руководство всегда стремилось быть "святее Папы Римского" то бишь Москвы». Вялікі Пост так паўплываў, ці што? Масква і Папа Рымскі – хто яго туды пусьціць?

Да таго ж з Папам Рымскім сёньня ўжо лічыцца нямодна – колькі ён не сачыняў энцыклік супраць вайны, амэрыканы ўсё адно закідалі Багдад сваімі старымі бомбамі і ракетамі.

Начальнік *Нашай Нівы* Андрэй Дынька сам вырашыў выступіць у ролі як калюмніста так і Папы Рымскага. Бог у дапамогу! Вялікаму караблю, як кажуць, вецер у ж... карму! Сэнтэнцыі галоўнага рэдактара тычацца іракскай вайнушкі:



Ага! А Буш –гэта Гітлер? Не? А хто выступае супраць Буша, той выступае супраць Гітлера? І Бушу паграгжае Нюрнбэргскі працэс? А хто тады будзе фінансаваць *Нашу Ніву*? Садам? Та-а-ак... трэба думаць, перад тым як пісаць... ●

Арсень Скаруліс,
палітуцякач

З падслуханай у аўтобусе размовы:
– Чаму не набываеш дачу? Ты ж даўно марыў.
– Нашто яна мне. Прыйдуць янкі і ўсе роўна разбамбяць.

Наступныя – мы!

«Наступнымі бамбіць будуць нас, беларусаў», – гэтая шальная думка, здаецца, крэпка засела ў мазгах маіх суайчыньнікаў. Як піша апошняя *Комсомолка*, пэрспэктыву зьяўленьня ў сваім двары марпехаў 1-ай дывізіі імя Абрагама Лінкальна рэальна разглядаюць усе: пэнсіянэры, прадаўцы, студэнты, таксісты... У менскіх школах вучні пішуць лісты Бушу ў Амэрыку з просьбамі ня кідаць на іхні родны горад «Тамагаўкі». Магчымасьць візыту амэрыканцаў шчыкочыць нэрвы і дае абільную прастору для палітычных фантазіяў.

Каля пад'ездаў старушкі-божыя адуванчыкі, у піўных барах алкашы, у ВНУ на перапынках студэнты-гуманітарыі складаюць заблытаныя геапалітычныя камбінацыі: падтрымае нас Расея ці не, будуць нас бамбіць вакуумнымі фугасамі, або касэтнымі бомбамі, і хто прыюціць бацьку ў выпадку вайны? Палітолягі не ўспрымаюць сур'ёзна рэзюмэ такога кшталту think tank. Як піша ў той жа *КП* Сьвятлана Навумава: «Толькі таму, што ў нас недэмакратычны рэжым, амэрыканцы на нас нападаць ня будуць...У аснове любой вайны ляжыць канфлікт інтарэсаў. Амэрыцы да нас няма справы, пакуль мы ня сталі ім пагражаць, або ня знойдзем у сябе шмат нафты». Прадстаўляем мы пагрозу інтарэсам ЗША або не – гэта аднаму Бушу вядома. Хіба Ірак, наяўнасьць зброі масавага зьнішчэньня ў якога гэтак і не давялі вайсковыя інспэктары, замінаў інтарэсам ЗША? Хіба бэн Ладэн, блаславўляючы сваіх фанатыкаў атакакваць вежы Сусьветнага цэнтру, карыстаўся дапамогай Багдаду? Аднак іракцаў бамбяць. Да таго ж, у нас ёсьць калійная соль.

Што нас чакае у выпадку пачатку заварушкі з Амэрыкай. Як дэманструе досьвед дзьвюх апошніх войнаў у Афгане і Іраку, тактычна такога кшталту канфлікт наўрадці будзе адрозьнівацца аж папярэдніх: амэрыканскія лётчыкі адуцюжыць усе вайсковыя базы і спальныя кварталы, а потым з наводкай апазыцыі пачнуць атакаваць наземныя мішэні. У такім разе будучы амэрыканска-беларускі канфлікт, калі, цьфу-цьфу-цьфу, ён натуральна адбудзецца, відавочна, стане рымэйкам сёньняшняй апэрацыі «Свабода Іраку». Мы можам з пэўнай доляй эвэнтуальнасьці зазірнуць у будучае, калі рэтраспэктуем на Беларусь эпізоды актуальнай барацьбы паміж Іракам і ЗША.

Паглядзім, што б адбывалася ў выпадку, калі б армада Пэнтагону атакавала 17 сакавіка не багдадзкага вора, а шклоўскага агуркавода. Вось вам віртуальная хроніка першых 20 дзён канфлікту.

КАЛІ Б ЗАЎТРА БЫЛА

Хроніка гіпатэтычнага віртуальнага ка

20.03.2003

На сьвітанку ў Менску завылі сырэны, пачуліся першыя выбухі ў раёне паміж ст. мэтро Кастрычніцкая і Пл.Незалежнасьці, дзе знаходзяцца сілавыя ведамствы і іншыя дзяржаўныя ўстановы. Белы Дом распаўсюдзіў афіцыйную заяву: вайсковая апэрацыя супраць Аляксандра Лукашэнкі пачалася. Адначасова амэрыканскае вайсковае камандаваньне на беларускай мове (пераклад Івонкі Сурвілы) зьвярнулася да народу Беларусі, выкарыстаўшы частоты дзяржаўнай радыёстанцыі «Сталіца». «Настаў той дзень, якога мы ўсе чакалі!», - кажацца ў звароце. У 8.32 на тэлеэкранах БТ, Першым музычным і ОНТ зьяўляецца Аляксандар Лукашэнка ў камуфляжы і зь вялікім праваслаўным крыжом на грудзях, абвяшчаючы Сьвятое Падзьвіжніцтва супраць Амэрыкі. Маюцца падазрэньні, што зварот быў запісаны задоўга раней. У 20.00 амэрыканскія СМІ паказваюць абстрэл Горадні часткамі 3-й пяхотнай дывізіі арміі ЗША, якія перасеклі літоўска-беларускую мяжу.

21.03.2003

Як перадала кампанія CNN, бранятанкавыя падразьдзяленьні амэрыкана-брытанскіх войскаў імкліва рухаюцца па беларускіх ельніках і бульбяных палях у напрамку Менску, не сустракаючы амаль аніякага супраціву з боку рэгулярнай беларускай арміі. Інфармацыю абвяргае эстонская незалежная тэлекампанія Аале-Джазіраайнэн, сьцьвярждаючы аб жорскіх баях, асабліва на поўдні ад Менску, каля Салігорска, дзе амэрыканскі дэсант спрабуе ўзяць пад кантроль крыніцы калійных угнаеньняў. Мяркуецца, што беларусы будуць праводзіць тактыку «ўгноенай зямлі», распыляючы соль, каб затрымаць рух праціўніка. На Палесьсі гараць каля 30 тарфянікаў. Украінскія ўлады кажуць, што гэта справа рук беларускіх вайскоўцаў. Каля поўдня, брытана-амэрыканскія чыгуначныя пехацінцы («вузкакалейныя коцікі») узялі штурмам Гайдуцішкі, буйную станцыю на мяжы зь Літвой. Рэшткі чыгуначных войскаў РБ працягваюць аказваць адчайны супраціў. Тым часам, у розных раёнах Менску зьнішчаныя каля 20 адміністратыўных будынкаў, паведамляе NBS. Над тэрыторыяй Літвы беларускімі СПА зьбіты першы амэрыканскі самалёт.

22.03.2003

У розных раёнах ЗША праходзяць антываенныя дэманстрацыі. Удзельнікі акцыі нясуць плякаты з пацыфісцкімі лёзунгамі і скандуюць «Не – крыві за соль!», «Вайне супраць Беларусі – не!» Амэрыканскія войскі выпусьцілі 5 крылатых ракетаў па разьмешчаным на тэрыторыі Беларусі (непадалёк ад Жыровічаў) базам ваенізаваных праваслаўных груповак, якія, магчыма, зьвязаныя з «Аль-Каідай», паведамляе брытанская Fox News. Беларускія супрацьпаветраныя сілы зьбілі ў небе над Менскам самалёт амэрыканскіх ВПС. Як сьцьвярджае *Советская Белоруссия*, два пілоты катапультаваліся.

23.03.2003

Сёньня ўначы авіяцыя антыбеларускай кааліцыі нанесла масіраваны бомбавы ўдар па родным горадзе беларускага лідэра Аляксандра Лукашэнкі – Шклову. Зьнішчаны саўгас «Гарадзец» і агурковыя плянтацыі. Беларускія войскі контратакуюць амэрыканскія пазыцыі ў раёне прыгранічнага гораду Гайдуцішкі. Тэлекампанія CNN вядзе прамую трансляцыю зь месца баёў. Пяць палонных амэрыканскіх салдатаў, сярод якіх адна жанчына, былі паказаныя па АТН і ў ток-шоў «Выбар». Двое з палонных параненыя. ЗША спадзяюцца, што з ваеннапалоннымі антыбеларускай кааліцыі будуць абыходзіцца гуманна. Аб гэтым заявіў Джордж Буш. Па ягоных словах, Аляксандар Лукашэнка згубіў кантроль над краінай.

24.03.2003

У Лос-Анджэлесе пачалася 75-я цырымонія ўручэньня прэміі «Оскар». Каля тэатру, дзе праходзіць раздача прызоў, сабраліся тысячы як праціўнікаў гэтак і прыхільнікаў вайны супраць Беларусі. Адкрыўся паўднёвы фронт. Амэрыкана-брытанскія войскі сумесна с паўстанцамі-палешукамі рухаюцца ў напрамку Салігорску. Падразьдзяленьні амэрыканскай арміі знайшлі вялікія склады, меркавана, атамнай зброі пад Рагачовам. Пры набліжэньні да дробных кантэйнэраў невядомага складу з этыкеткамі «Сгущеное молоко» дазымэтры вайскоўцаў зашкальвалі. Магчыма, партатыўныя бомбы прызначаліся для тэрактаў на тэрыторыі краінаў-саюзьнікаў ЗША. Тым часам, у сваім 25-хвілінавым выступе па БТ прэзыдэнт Лукашэнка паабяцаў рай мучанікам беларускагу народу і запэўніў нацыю, што Бог на баку беларусаў.

25.03.2003

Амэрыканцы абвінавацілі Беларусь у выкарстаньні нячэсных прыёмаў вядзеньня вайны. Выкідваючы белы сьцяг, беларускія вайскоўцы спрабуюць заманіць амэрыканскіх салдатаў у пастку. Такія дзеяньні беларусаў можна расцаніць як тэракт, сьцьвярджаюць прадстаўнікі кааліцыі. Амэрыканскае камандаваньне дапускае, што небывала моцная паводка можа запаволіць рух войскаў кааліцыі. Беларускі тэрарыст-самазабойца ў грамадзянскай вопратцы (дублёнка і джынсы Levi Strauss вытворчасьці Польшчы) зьнішчыў амэрыканскі танк на захадзе Беларусі, заявіў сёньня міністар абароны Беларусі Мальцаў. BBC News перадае, што ў Горадні пачалося народнае паўстаньне. Беларуская армія расстрэльвае пэрфомансы пратэстуючых супраць рэжыму Лукашэнкі. Прэс-цэнтар камандаваньня войскамі кааліцыі ў Вільні паведаміў, што ў палон да

08.04.2003

09.04.2003

26.03.2003

24.03.2003

22.03.2003

23.03.2003

25.03.2003

09.04.2003

...а вайна...

...та канфлікту

саюзнікаў здалася 81-я дывізія спэцназу чыгуначных войскаў Беларусі.

26.03.2003

Інфармацыя аб антылукашэнкаўскіх бунтах у Горадні і здачы ў палон 81-ай дывізіі аказалася дэзынфармацыяй, паведамляе француская Le Monde. Беларускія ўлады абвінавачваюць войскі англа-амэрыканскай кааліцыі ў выкраданьні (кіднэпінгу) дзясяткаў тысяч жыхароў мясцовых вёсак і выдаючы апошніх за ваеннапалонных, захопленых у ходзе баёў за Гайдуцішкі і паблізу Глыбокага, перадае Reuters. Па меншай меры некалькі дзясяткаў чалавек загінула на менскім рынку Камароўка ў выніку выбуху бомбы, скінутай авіяцыйй кааліцыі, паведамляе агенства Reuters. Колькасьць параненых невядомая. Саюзнікі абвінавачваюць рэжым Лукашэнкі ў адмысловым размяшчэньні рынкаў побач зь дзяржаўнымі ўстановамі (Акадэмія фізвыхаваньня), куды накіроўваліся ўдары ракетаў.

27.03.2003

ЗША не дазволяць ААН ажыцьцяўляць кантроль над пасьляваенным перабудаваньнем Беларусі, заявіў дзяржсакратар ЗША Колін Паўэл. Тым часам, ф'ючэрсныя цэны на калійную соль зноў узрасьлі, што абумоўлена нявызначанасьцю яе далейшых паставак на сусьветны рынак у сувязі з зацягваньнем вайны ў Беларусі.

28.03.2003

Войскі Лукашэнкі могуць прымяніць атамную зброю ў тым выпадку, калі Менск будзе ўзяты ў кальцо. Аб гэтым заявіла апазыцыйнае радыё «Voice of Belarus», якое вяшчае з тэрыторыі Чэхіі. Пяць амэрыканскіх ваеннаслужачых забітыя ў выніку выбуху бомбы, арганізаванага беларускім камікадзэ, які пад'ехаў на маршрутным таксі да блокпосту саюзнікаў каля гораду Ваўкавыск.



30.03.2003


20.03.2003


07.04.2003

07.04.2003


05.04.2003


28.03.2003

25.03.2003



25.03.2003


21.03.2003


...3.03.2003

Тым часам Рада Бясьпекі ААН сёньня адзінагалосна прагаласавала за рэзалюцыю, якая ўзнаўляе дзейнасьць праграмы «Соль у абмен на газ».

29.03.2003

Два амэрыканскіх зьнішчальніка-бамбардзіроўшчыка F-15E Strike Eagle паразілі хату ў прыватным сэктары Гомеля, дзе праходзіла сустрэча 145 узброеных апалчэнцаў, верных Аляксандру Лукашэнку, паведамляе Associated Press. Для атакі была выкарыстаная ракета з лазэрнай наводкай, якая ўзрывается толькі пасьля пранікненьня ў памяшканьне. Камандаваньне ЗША адзначыла, што Царква мармонаў, якая знаходзіцца ў 300 метрах ад аб'екту, не пацярпела.

30.03.2003

Тэрарыстычная праваслаўная групоўка «Слава Богу!», па інфармацыі ЦРУ цесна зьвязаная з Аль-Каідай, страціла сёньня адну са сваіх базаў на поўдні Беларусі. База была разгромленая ўзброенымі баптыстамі Патрыятычнага саюзу Палесься. Беларускія войскі пачалі абстрэл палескіх пазыцыяў непадалёк ад Лунінца. Тым часам, Украіна настойвае на ўводзе сваіх войскаў у 20-кілямэтровую буфэрную зону на поўдні Беларусі, каб прадухіліць бескантрольны рух уцекачоў. Як заявіў міністар аховы здароўя РБ (імя?), за першы тыдзень вайны загінула 350 мірных жыхароў, каля 4000 атрымалі раненьні.

31.03.2003

Міністар замежных справаў РБ заявіў, што больш за пяць тысяч дабраахвотнікаў прыбылі ў Менск для абароны беларускай сталіцы ад амэрыканскіх войскаў. Спэцыяльны прадстаўнік ЗША ў Беларусі Майкл Козак запэўніў афіцыйны Кіеў, што беларускія палешукі не будуць аднабакова захопліваць горад Пінск, агурковы цэнтар на поўдні Беларусі. «Палескія фармаваньні знаходзяцца пад кантролем амэрыканскіх сілаў, і бяз нашага кіраўніцтва нікуды не пойдуць».

01.04.2003

Усе жартуюць...

02.04.2003

У выніку бамбёжак мікрараёнаў Сухарава і Вясьнянка загінулі 33 мірных жыхара. Тым часам, ваеннаслужачым ЗША ўдалося выратаваць з палону салдата УС ЗША – 19-гадовую радавую з штата Вірджынія. А прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка заклікаў беларусаў супраціўляцца акупантам: «Змагайцесь за ўсё так, каб Беларусь – бастыён праваслаўнай веры і законаў – быў выратаваны, і наша нацыя выйшла з гэтага крызысу пераможцам».

03.04.2003

Сілы кааліцыі працягваюць наступаць на Менск. Каля аэрапорта Менск-2 чуваць выбухі і стрэлы. БТ сьцьвярджае, што аэрапорт пакуль што кантралююцца беларускімі вайскоўцамі, хаця пару гадзінаў таму амэрыканцы сьцьвярджалі, што аэрапорт узяты. Адначасова, у прыгарадным пасёлку Навінкі, амэрыканскі патруль расстраляў цялегу, на якой ехала сям'я грамадзян, калі тая пад'яджала да блокпосту. Большая частка сталіцы засталася без электрычнасьці. Колін Паўэл распавёў аб сваіх плянах наконт новага ўраду Беларусі: «Мы жадаем, каб туды ўвайшлі прадстаўнікі беларускай іміграцыі і разнастайных апазыцыйных сілаў, што падтрымліваюць БНР».

04.04.2003

Амэрыканскія войскі цалкам захапілі аэрапорт Менск-2, не сустрэўшы аніякага супраціву, паведамляе ABC News. Аднак гадзінай пазьней, тэлекампанія CBS пацьвердзіла, што аэрапорт кантралюецца ня цалкам. На адной са стаянак дагэтуль знаходзіцца ўласны самалёт Аляксандра Лукашэнкі. Два выбухі прагрымелі ў прыгарадзе Токіо паблізу ад амэрыканкай базы. Маркуецца, што тэракт – справа рук працўнікаў вайны ў Беларусі. Амэрыканскія войскі абстралялі грамадзян ЗША, якія ўдзельнічалі ў ахове беларускіх аб'ектаў жыцьцезабесьпячэньня ў якасьці «жывога шчыта».

05.04.2003

Абвінавачаньне ў забойстве высунута супраць сяржанта 101-й дэсантнай дывізіі ЗША Джэфры Бусьліка за пакушэньне на сваіх саслужыўцаў. Праваслаўны жыхар штата Вірджынія кінуў гранату ў афіцэрскую палатку, у выніку чаго загінулі два чалавекі. Тэлеканал CNN прадэманстраваў кадры, дзе амэрыканскія танкі павольна рухаюцца на менскай вуліцы Розы Люксэмбург і дасьледуюць тэрыторыю побач з кафэ «Гномік», пад якім павінен знаходзіцца адзін з бункераў Лукашэнкі. Вуліцы пустыя, ніякіх прыкметаў супраціву ня бачна. Гэтыя паведамленьні абвергі мэр Менску Паўлаў.

06.04.2003

Дзяржаўнае тэлебачаньне Беларусі прадэманстравала кадры сустрэчы прэзыдэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі са сваімі сынамі Віцем і Дзімам, бліжэйшымі дарадцамі і высокапастаўленымі вайскоўцамі. Прэзыдэнт, апранутпы, як звычайна, у камуфляжны фрэнч, сядзеў за сталом у адным з пакояў свайго бункеру і ветліва ўсьміхаўся. У той жа час, беларуская ўлады ўводзяць у Менску каменданцкі час. Колькасьць ахвяраў бамбардзіровак у сталіцы настолькі вялікая, што ў шпіталях перасталі лічыць загінуўшых, заявіў Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа. Пры выездзе з Менску з боку маскоўскай шашы былі абстраляныя расейскія дыпламаты. Маюцца параненыя. А на поўдні Беларусі амэрыканцы памылкова разбамбілі канвой, у якім знаходзіліся амэрыканскія спэцназаўцы і палешукі, паведамляе BBC – загінуў высокапастаўлены палескі палітычны дзеяч Мікола Шалягові.

07.04.2003

Беларускія ўлады абвергі інфармацыю аб узяцьці брытанцамі Горадні. Горад працягвае абарону, нягледзячы на тое, што больш за 700 байцоў ЗУБРа прыляцелі на захад Беларусі, каб прыняць удзел у баях за Горадню і Белавескую пушчу. А амэрыканскія войскі пачалі наступленьне на менскі даўн-таўн. У 09.20 тэлекампанія Fox News паказала заняты амэрыканцамі прэзыдэнцкі палац на Карла Маркса, 38. Акрамя гэтага, узятыя пад кантроль некалькі лядовых палацаў, над якімі таксама развіваецца амэрыканскі сьцяг.

08.04.2003

Пры штурме цэнтру гораду амэрыканцы абстралялі гатэль «Прыднястроўе», у якой размяшчаюцца міжнародныя журналісты. У выніку ўкраінскі журналіст быў забіты. Як паведамляе эстонская тэлекампанія Аале-Джазірайнэн, падчас баёў у горадзе ад рук амэрыканскіх салдатаў быў забіты журналіст гэтай тэлекампаніі. Як лічыць кіраўніцтва Аале-Джазірайнэн, ён быў забіты наўмысна. Паводле інфармацыі CNN, сэнатары штату Юта выступілі з законапраектам, паводле якога ўсе пацыфісты, што выступаюць супраць вайны ў Беларусі, будуць прыроўненыя да тэрарыстаў з усімі выцякаючымі адсюль наступствамі.

09.04.2003

Баі ідуць амаль у самым цэнтры беларускай сталіцы. У Менску пачался бескантрольнае марадзёрства. Людзі раскрадаюць урадавыя ўстановы і офісы вэртыкалі, выносячы адтуль мэблю, аргтэхніку, клюшкі, лыжы й гаршкі з кактусамі. Прайшла інфармацыя, што Лукашэнка пакінуў Менск і ў дадзены момант хаваецца ў балотах.

10.04.2003

У Менску ўсё спакойна...

ДАты

За ўсё прыгожае!

Тыя, хто не пасьпеў адзначыць **1 красавіка** 250 ўгодкі са дня народзінаў Жазэфа дэ Мэстра, роднага бацькі кансэрватызму і палітычнага экстрэмізму, могуць спакойна зрабіць гэта па старому стылю – праз два тыдні па юліянскім календары зноў будзе 1красавіка, гэтак кажучы, праваслаўны Дзень гумару. Жазэф дэ Мэстр слаўны яшчэ й тым, што можа па поўнаму праву лічыцца патронам усіх развадзілаў. Пры двары Аляксандра I граф служыў паслом Сардыніі, неіснуючай на той час дзяржавы, пэнсіён каралю якой выплочваўся з кішэні расейскіх падаткаплацельшчыкаў. Граф на гэтыя грошы жыў не сумаваў, а яшчэ займаўся контррэвалюцыйнай агітацыяй (наязжаў на дзеячоў францускай рэвалюцыі, справа, у той час, як ня менш знакаміты крытык францускай рэвалюцыі маркіз дэ Сад займаўся тым самым, толькі зь левага боку)

У красавіку ўвогуле сьвяткуюцца 450 ўгодкі са дня сьмерці Франсуа Рабле (1494-1553) – легендарнага францускага пісьменьніка, аўтара энцыкляпэдыі францускага жыцьця Рэнэсансу «Гарганцюа і Пантагруэль».(Стрытэйджэры могуць адпачыць). Дакладная дата невядомая, таму ўвесь красавік можна выконваць параду, якую даў Панургу аракул Боскай бутэлькі: «Трынк!», што значыць: «Бухай!»

10 красавіка 120 год са дня нараджэньня Аляксея Талстога — савецкага графа і таты Бураціна (1883-1945). Шмат пісалі пра гэтую загадкавую казку, дзе нібыта на сюжэт італьянца Калодзі Талстой наклаў сатыру на савецкую рэчаіснасьць, пад татай Карла вывеў Карла Маркса, а пад Карабасам Барабасам – рэжысэра-фармаліста Меерхольда.

12 акрамя дня касманаўтыкі можна адзначыць 375 год са дня нараджэння казачніка Шарля Пэро (1628-1703), які прыдумаў Ката ў ботах, Папялушку і Чырвоны Каптурок напачатку дзеля забавы сьвецкіх дам і казкі мелі эратычны зьмест. Пасьля ўжо суровыя пэдагогі выкрэсьлівалі палавыя гульні ваўка з бабуляй перад зьдзяйсьненьнем акту эратычнага канібалізму.

15 красавіка 100 год са дня нараджэньня Эрыха Арэндта (1903-1984), нямецкага паэта-антыфашыста, які змагаўся ў гішпанскіх брыгадах у 1936-39. Доўга жыў у Паўднёвай Амэрыцы, пасьля ў ГДР.

На сьмерць паэта

Калі паэт ператвараецца ў манаграфіста

Ігар Бабкоў
Філасофія Яна Снядэцкага
Вільня, 2002

Ігар Бабкоў вядомы, як аматар шакіраваць публіку. У 1980-я песьня на ягоныя вершы ў выкананьні Касі Камоцкай «тата купі мне карблік» атрымала



вядомасьць і прызнаньне сярод камароўскіх растаманаў, якія караблікам прызвычаіліся называць карабок марыхуаны. Часопіс *Фрагмэнты*, рэдактарам якога з 1998 года ажно да пачатку Калі-Югі ў Беларусі нязьменна быў І.Бабкоў, таксама быў надзвычай шчодры на тэксты з эпатуючым і раздражняючым дробнамяшчанскую сьвядомасьць зьместам. Напрыклад першы пасьлярэфэрэндумаўскі нумар часопіса *Фрагмэнты* пачынаўся з рэдактарскага артыкула «Народ памёр». Гэтым самым Бабкоў паставіў сябе ў адзін шэраг з вялікімі папярэднікамі, канстататарамі «сьмерці»: Ніцшэ, Фуко, і Бартам, якія сьцьвердзілі па чарзе: сьмерць Бога, Чалавека і Аўтара. У інтэрпрэтацыі Бабкова гэта значыць, што памерлі ілюзіі дэмакратычнай інтэлігенцыі на народ, памерла ілюзія пад назвай «народ», на якую ўкладалі свае спадзяваньні інтэлектуалы. З другога боку, нябожчыкаў бабкоўскіх папярэднікаў – абстрактных Бога, Чалавека і Аўтара ніхто ніколі ня бачыў жывымі і здаровымі, таму і паведамленьне пра іх сьмерць нікога асабліва не хвалявала. Калі Бабкоў аб'явіў сьмерць народа, якога кожны мае шанец сустрэць штодня на вуліцы,таму зьвесткі пра заўчасную «сьмерць народа» падаваліся крыху перабольшанымі.

У 2000-м годзе выйшаў даўгачаканы «раман» Ігара Бабкова «Адам Клакоцкі я яго цені», які задаволіў духоўныя патрэбы аматараў чытаніны пра тое, што «хто пісаў ня зная, а я, дурань,чытаю». У некаторых фрагмэнтах рамана (у якім бачацца даволі празрыстыя намёкі на знаёмасьць аўтара з Картасарам і Борхесам ды й іншымі аматарамі муціць ваду на чыстым месцы), можна пазнаць некаторыя знаёмыя рэаліі:

«У гэтай частцы сьвету (у тэкстах Клакоцкі называў яе заўсёды Паўночнай Сарматыяй, але ў прыватных гутарках – Вялікім Шпіталем) няма нічога вызначанага: лёгшы спаць балтам ты прачынаесься славянінам, выйшаўшы з дому палякам, вяртаесься немцам, з усіх бакоў цябе спрабуюць пераканаць, кім ты ёсьць і кім ты ня мусіш быць.»

Але вось, паэт, натхнёны наратар міфаў пра Паўночны Шпіталь для сарматаў выдаў нарэшце яшчэ адзін твор. Як тут не ўзгадаць:

«І якраз у гэты момант увайшла здань самотнага манагрфіста Фінегана Зялёнага».

Кніга «Філасофія Яна Снядэцкага» кардынальна розьніцца ад усяго, што было напісанаБабковым раней. Аматары загадак безумоўна знойдуць глебу для разважаньняў і месца для мэдытацыйнага дыванка. Напрыклад,спасылка №12 да кнігі спасылае на... саму сябе!

Так, «Філасофія Яна Снядэцкага, Вільня, 2002». Гэта вам не кітайскі цмок, які кусае свой хвост! Між тым, кніга – гэта нішто іншае, як кандыдацкая дысэртацыя Бабкова па філязофіі, якую той зьбіраецца бараніць. Адно гэта зьяўляецца фактам станоўчым. Праўда, для абмежаванага кола спэцыялістаў. Усе ведаюць, што пачытаць поўны тэкст кандыдацкай дысэртацыі па гуманітарных дысцыплінах у нашых бібліятэках могуць толькі дактары навук. Такое правіла. Таму, аматары пісаньня навуковых прац могуць спакойна адшкадаваць пару-тройку тысячаў на рарытэт. З надпісам «Фрагмэнты 10»—часопіс, якога ўжо няма.

Ulica Wszystkich Swietych
Незалежнае выдавецтва, 2003

Вэтэран люблінскага самвыдату Леле (ён справа на вокладцы) даслаў нам чарговы нумар свайго зіну. «Вуліца» значна адрозьніваецца ад нашых мясцовых зінаў, бо робіцца людзьмі сталымі і сур'ёзнымі, фактычна DIY тут толькі ў фармаце – складзеныя паплам аркушы А4, ніяк не сшытыя.

Па зьмесьце – самы звычайны польскі літаратурна-мастацкі часопіс, якіх там выходзіць з паўсотні, калі ня больш. Там уся гэтая хваля пачалася значна раней, таму можна спадзявацца, што падобная бяда чакае і нашых кандовых DIY-шчыкаў – Грына, Ленін і Джэці (асабліва, калі апошнія пасканчаюць свае асьпірантуры), іншых дзеячоў мастацтва.

Вось, напрыклад, урывак з тэатральнай п'есы пад назвай «Няма», надрукаванай у нумары *Ulicy*:

Mnie tu nie ma. Tak. Nawet tu mnie nie ma. Ni chuja. Ja podzielony, ja nie jestem...

Відавочная замарочанасьць польскай анархатусоўкі гуманітарнай адукацыяй вершамі Herberta i Milosza. Афарызмы і паэмы ў прозе.

Наступства – галоўны грэх сумневу. Аднаго разу распачатая гэтая працэдура хутка ператварае сьвет у руіны, робіць так, што сонца перастае сьвяціць, а багі паміраюць. І тады, перад аблiччам зьнішчэньня і бессэнсоўнасьці адныя зьдзяйсьняюць самазабойства, а другія пачынаюць працаваць і адбудоўваюць тое, што самі зьнішчылі. Выглядае так, як быццам можна было б вараціць стары парадак і акруціць час назад ажно да Дэкарта.

Ёсьць парады для актыўных юзераў інтэрнэту, якія занадта актыўна дыскутуюць на чатах і іх выкідваюць сьвірэпыя адміны. Нам пакуль гэта не пагражае. У беларускамоўным нэце вольна адчуваць сябе нават самыя яўныя экстрэмісты.

Польскія зіны – гэта не толькі тое, што нас магчыма чакае, а тое, што можа рабіць кожны і не спадзявацца на літасьць рэдактараў «тоўстых часопісаў», якія мараць разьвесьці рэдкіх грантадаўцаў і якім да лямпачкі зьмест, выгляд і ўвогуле праблемы аўтараў. Зрабі свой DIY з дапамогай нажніцаў, клею і ксэраксу, будзеш сам сабе рэдактар ●


П. Якубовіч,
рэдактар фан-зіну СБ

Цінта Брасу – 70!

Парнуха як адзін зь відаў мастацтва

26 сакавіка па грэгарыянскім календары італьянскаму рэжысэнто Цінта Брасу споўнілася 70 год. Пачэсная дата! Тут бы й на спакой. Але год таму, акурат 12 красавіка 2002 году старычына Цінта зьняў свой апошні фільм – «Senso'45».

Першае сваё кіно Цінта Брас пачаў здымаць яшчэ ў 1964 годзе. Хто пра яго ведаў? Акрамя спэцыялістаў, ніхто. «Калігула» з Малькальм Макдаўэлам прынёс аўтару сусьветную вядомасьць. Пасьля быў «Ключ» (La Chiave), які проста ўзьнёс Браса на пантэон эўрапейскага кіно. Калі посьпех «Калігулы» можна тлумачыць гульнёй бясспрэчных зорак, такіх як Малькальм, які выцягне якую заўгодна стужку, то «Ключ» застаецца яўнай і абгрунтаванай заяўкай на бесьсьмяротнасьць у эўрапейскім мастацтве. Мэтафізычная звышзадача фільма - праілюстраваць філязофію італьянскага фашызму мовай эротыкі. Палавы акт пад гукі фашыстоўскага маршу – састарэлая Італія спрабуе аднавіць свае



сілы з дапамогай энэргіі, якая ёй не падпарадкоўваецца, дэкаданс саступае жыцьцёвасьці. Зь цягам часу маэстра зышоў да сьпяваньня кантатаў фізыялёгіі простага спалучэньня, сёньня ён часьцей выступае ў ролі арганізатара, прад'юсэра, мэнэджэра фільмаў, пакідаючы поле прыкладаньня творчай энэргіі маладым, злым і няўрымсьлівым. Хто паўторыць «All Ladies Do It»? – фільм нарабіў фурору ў эўрапейскіх акадэмічных колах. Сюжэт просты: чувырла зваліла ад мужа, у якога праблемы, і кінулася ва ўсе цяжкія. Але—якія геніяльныя кадры, якія цытаты з кіношных папярэднікаў! Калі трэба, Цінта можа і на Таркоўскага спаслацца і на Бэргмана. Сужонская пара атрымлівае ўзаемаразуменьне, калі натыкаецца на каклекцыю эратычных фільмаў 30-х гадоў, што ў сымбалічнай форме здымае ўяўныя пакровы з «таталітарнага мадэрну 30-х» і ўсталяе сувязь пакаленьняў эўрапейскіх лібэртынаў. Сярэдні эўрапеец са сваімі сэксуальнымі праблемамі аказваецца больш сымпатычным, чым яго сучасьнікі, якія выконваюць вялікую місію па загаду альбо дыктатараў, альбо бясспрэчных змагароў з дыктатурамі. Дасканала валодаючы тэхнікай сучаснага элітарнага кіно, Цінта Брас узьнёс звычайную парнушку на вышыню твору мастацтва, пра які не сорамна ламаць дзіды масьцітым крытыкам кінематаграфіі. Спадзяемся, што ў майстра будуць геніяльныя вучні, якія не пакінуць ані каменьчыка ад нашых уяўленьняў пра эўрапейскае кіно ●

Мікіта Ні-Халкоў,
рэжысэр



Яп-понскі бог!.. Ратуй дзяцей!..

Аказваецца, мульты Дыснэя – танная падробка самурайскага анімэ

Некалькі гадоў таму наша краіна перажыла нашэсьце Пакемонаў. Гэтыя, на першы погляд, цалкам звычайныя зьвяркі праз блакітныя экраны рабілі зь дзецьмі злобныя рэчы: дзеці ня толькі дакраналіся патыліцамі да экранаў, яны проста адмаўляліся нават есьці без чарговай сэрыі тэленаркотыку. І такое становішча было ня толькі ў нас. Калі ў 2001 годзе адзін мульт, па іхнему анімэ, зрубіў гран-пры Бэрлінскага кінафэстывалю, усе пачалі базарыць пра нейкі другі «японскі ўдар».

Першы бум на японскія мульцяхі быў у 50-60 гадах, калі на сусьветны ўзровень павылазілі японскія вундэркінды Акіра Курасава, Кендзы Міндзогуці і Ясудзіро Одзу. Зараз жа японцы ня толькі зноў грузанулі сьвет, але й адхапілі «Оскара» за лепшы анімацыйны фільм. Пачатак анімэ вядзе свой радавод яшчэ са старажытных часоў японскай гісторыі, калі мясцовыя мастакі падхалтурвалі гравюрамі – гэтак званымі «Манга» («неабавязковымі малюнкамі»: тэрмін выдумаў нейкі Хокусаі (1760-1849)). Цяпер быць мастаком коміксаў – вельмі ганаровая праца. Напрыклад, клясычны піянэр японскай анімацыі Асама Тэзука нават мае музэй на радзіме ў свой гонар. Кожны мастак ці група мастакоў ня толькі вядомая ў сваім квартале, але калі па іхных коміксах з арыгінальнай ідэяй будзе зьнятая тэлевізійная вэрсія ці поўнамэтражка, яны адразу пераходзяць у стан нацыянальных герояў, прычым уся праца над анімэ вядзецца ўручную напрацягу не аднаго году. Таму японцы задзіраюць насы перад іншымі чужымі мультыплікатарамі.

Але пад нявіннай формай японскага цуду – аграмадныя вочы, утончаныя рысы твару – хаваецца зусім не дзіцячы зьмест. Анімэ мае шмат разнавіднасьцяў, напрыклад, ня толькі рамантычныя прыгоды для дзяўчынак – «Сёдзё», але і «Сёнён» – ужо больш жорсткая рэчаіснасьць: гэта розныя войны, адзінаборствы, барацьба зь нячыстай сілай. Увогуле большая частка анімэ мае ўзроставае абмежаваньне да 18 гадоў. Там мы можам пабачыць ня толькі кроў і гвалт, але й проста жудасныя футарыстычныя карціны апакаліпсысу. Сюжэтныя лініі закручаныя і выкручаныя, адначасова б'юцца дзясяткі герояў, а каб пазнаць, хто добры, а хто злы, трэба зрабіць такі мазгавы фінт, што нават непадрыхтаваны чэл проста будзе тупа глядзець на экран упітываючы ў сябе яркія каляровая плямы хутка мільгаючых малюнкаў, якія запраста замбіруюць і перарабляюць у шэрую кашу падсьвядомасьць падлеткаў. «Стрыган», «Манускрыпт ніньдзя», «Сакура: вайна сьветаў» – вось толькі некалькі культавых анімэ, якія селевым патокам хлынулі на рынкі нашай краіны, расплюшчваючы неакрэплыя галовы падлеткаў. Адначасова з гэтымі жанрамі існуюць і добра сябе адчуваюць і больш жорсткія рэчы – такое, як «Хёнтай» – анімэ, проста кажучы, – гэта садамазапорна ў клясычным японскім выглядзе. Тут існуюць ня толькі наіўныя супэрдэформы – гэта калі башка з баклажан, а тулава вельмі маленькае і г.д., але ўвогуле галоўныя героі ня толькі проста кожныя 15 хвілін зьмяняюць пол на супрацьлеглы, але і б'юць-лупяць па чым сьвет адзін аднаго чым бог паслаў, адначасова прагна ўздыхаючы ад кайфу.

Вядома, гэта нармальнага чалавека – калі ў яго любімая праца, спорт, кнігі – уся гэтая фігня не цікавіць. Але ў кожнага ёсьць малыя дзеці, якія на добрыя заробкі радакоў з-пад палы ў пірацкай краме запраста могуць набыць усё гэтае шаленства. Што тады адбудзеца – зьвязьдец! Бо што японцу добра, тое беларусу – сьмерць. Японец на працягу ўсяго жыцьця без усялякай небясьпекі для здароўя ўжывае ўсё гэта, бо ў Краіне Ўзыходзячага Сонца – ані гвалту, ані вычварэнцаў-маньякаў. А ў нас толькі ад адных крымінальных навін зь яшчыку падвышаецца ўзровень злачынстваў і гвалту. Японцы спакойныя, як сланы, і ўсё ў іх добра. Нават калі эўрапейцы ці амэрыкосы ўзгадваюць свой «першы раз», толькі палова гаворыць, што гэта было добра, а вось японцы ня б'юць тварам у гразьзё: амаль больш за 75% апытаных гаворыць, што ў іх Гэта адбылося нашмат лепш, чым яны ўвогуле маглі сабе ўявіць. У чым тайна? Ці ў тым, што японцы ня ведалі хрысьціянства з яго ным аскетычным страхам і сорамам перад фізыялягічнымі патрэбамі? Ці ў тым, што японцы проста клапоцяцца аб сабе, задавальняючы любое жаданьне ці тое ўзьнёсла духоўнае, ці тое зямное – чытай, цялесныя ўгоды? Ці ў тым, што яны гадзінамі могуць разглядаць коміксы і круцяць у запой анімэ на працягу ўсіх 24 гадзінаў? Гэта невядома. Вось толькі самая крывавая карцінка не ўваб'е ў чырвань сустракальніка сонейка, але натхніць на верш-хоку: «Падлетак без старэйшага палюбоўніка – усё роўна што жанчына бяз мужа. Прыемна» ●

Разьвядзі буржуя

Кожны – сам будаўнік свайго шчасьця. Калі адбылося так, што ты апынуўся ў кювеце жыцьця – не хвалюйся, побач гуляе нямала лохаў зь недзіцячымі пянёндзамі. Табе трэба толькі знайсьці і ціхенька падкаціць да чувака, якому і так сумна жыць на белым сьвеце, ён толькі й чакае прыгод і авантур... Вось тут і куй, пакуль гарачае!



МОЙ ХЛОПЧЫК

Фільм:
Пола і Крыса Вайсаў
У ролях:
Х'ю Грант, Тоні Колет, Рэйчэл Вайс

1. Чувак ніколі не працаваў. Жыве на бацькавы бабкі. Ні з адной жанчынай не сустракаўся больш за 2 тыдні. Вырашыў акучваць маладых адзінокіх мамаш.
2. Ён выпадкова знаёміцца з пацаном, які адразу прасёк гэтую фішку і сам бярэ чувырлу ў абарот.
3. Маці пацана не сябруе з дахам і пытаецца накласьці на сябе рукі, пацан гэты выпадак па-майстэрску апрацоўвае.
4. «Сябруй з мамкай, і я маўчу пра тое, што ты водзіш за нос адзінокіх мамаш».
5. Ён глядзіць з чуваком тэлешоў і той ужо набывае пацану супэркрасачы за 60 фунтаў.
6. Дзіўнае сяброўства з 12-гадовым пацаном прыводзіць да скандалу.
7. Красачы скралі, але чувак сьвяткуе Каляды. Ён + мамаша + былы муж мамашы + ягоная сяброўка Лінда + мамаша Лінды.
8. Чувак знайшоў другую адзінокую бабу. Дамовіўшыся з пацаном, ён выдае яго за свайго сына.
9. Цяпер пацан жадае пасьпяваць на школьным фэсьце. Чуваку нічога не застаецца рабіць, як выйсьці зь ім перад дзецьмі зь песьняй "Пяшчотна забіваючы".
10. Яны зноў сустракаюць разам Каляды. І ўжо ў чувака на хаце. Усё, як гаварыцца, чыкі-пыкі...



КАХАНЬНЕ З ПАВЕДАМЛЕНЬНЕМ

Фільм:
Марка Лоўрэнса
У ролях:
Х'ю Грант, Сандра Балак

1. Што рабіць жанчыне, якая сваім целам забараняе разбурыць дамы – вядома ж, уладкавацца на працу да таго, хто робіць гэткую фігню.
2. Трымай свайго сябра бліжэй, а ворага яшчэ бліжэй, тым больш калі ён не бярэ рэшты з соткі, набыўшы хот-дог.
3. Спрабуй пытаньні на густ, прычым не ў пераносным сэнсе. Адганяй сэкс-дзевак ад боса.
4. Замароч як мага больш яму башку сваімі аповедамі. Цяпер ён ня можа безь цябе і рыпнуца.
5. Напіся і паабяцай яму бурны сэкс без тармазоў, а потым ламані.
6. Хадзі зь ім на бэйсбол і тэніс, а потым, калі вы знаходзіцеся ў аўтамабільным заторы, зрабі від, што ў цябе панос і папрасі дапамогі.
7. Зьявіся на бізнэс-прыём у касьцюме клоўна, з бруднымі рукамі адкалі што-небудзь неверагоднае.
8. Калі на гарызонце намалявалася суперніца, адразу бяжы з працы, кінуўшы нафіг усё недаробленым.
9. Ён крычыць і абзывае цябе – не хвалюйся, разгарніся й спакойна рухайся дадому.
10. Цяпер мужык гатовы, ён пазбаўлены працы і ніколі ня будзе руйнаваць дамы. Хапай яго, пакуль ён гарачы, і вядзі знаёміць з радакамі.

BANKER_KV@YAHOO.COM

! Таварышы дарослыя ! Хавайце відэакасэты ад дзяцей !

Кіно вачыма дзіцяці





КАЛІ Я ЗНОЎ ЗАСТАЛАСЯ ДОМА АДНА, Я ПАГЛЯДЗЕЛА ВОСЬ ЯКІ ФІЛЬМ...

Нядаўна разьведзеная Мэг Альтман і ейная дачка, калі ў іхны дом утаргаюцца злачынцы, аказваюцца зачыненымі у патаемным пакоі свайго нядаўна набытага Нью-Ёрскага асабняку. Пакой, спэцыяльна прадугледжаны да гэткага выпадку, ператвараецца ў мышалоўку, бо тое, што жадаюць узяць няпрошаныя госьці, знахродзіцца менавіта ў ёй.

ПАКОЙ СТРАХУ
Фільм: Дэвіда Фінчэра.
У ролях: Джодзі Фостэр, Крыстэн Сцюард, Форэст Уінтэйклэр




«Гэта будзе мой пакой», – казала дачка, хворая на цукровы дыябэт.



Калі маці абмывала пакупку вінцом, у дом улезьлі злачынцы



Маці і дачка схаваліся ў патаемным пакоі, але злачынцам патрэбна менавіта туды



Яны пусьцілі туды газ, а маці кінула запалку ў шахту для вэнтыляцыі.



Адзін дзядзька застрэліў другога злачынца, калі той жадаў зваліць, а маці ў гэты час набегла за лякарствамі для дачкі.



Пабіўшы мужа, які прыйшоў на дапамогу, дзядзькі забеглі ў пакой. Лякарства ўнутры ў цёткі пісталет, а дзядзьку прышчаміла дзьвярыма руку.



Цётка моцна набіла кувалдай злога дзядзьку, бацька жадаў прыстраліць чужакоў, а дачка крычала: «Не страляй у тоўстага, ён добры!»



Тоўсты потым забіў злога, але і копы ўжо панабеглі.

Калі ў хату лезе чужы, набяры нумар 02, разьбі вакно, і ніколі не зачыняйся ў кладоўцы

Неба, дзяўчына і тэрарызм

Новы фільм Рэнаты Літвінавай ў сьвятле апошніх падзеяў

Сьцюардэса глядзіць усьлед адлятаючаму авіялайнэру. Каляровы плякат мог бы выглядаць, як рэкляма «Лятайце самалётамі Аэрафлоту!», калі б ня дзіўная нэрвовая ўсьмешка, блукаючая на вуснах дзяўчыны і вочы, у якіх пульсуе боль. Гляджу на афішу ў фае кінатэатру, і міжволі цягнуцца рукі, каб дакрануцца, зьняць, скрасьці, прынесьці дахаты і мець на сьцяне свой кавалачак неба і горкую дзявочую ўсьмешку ў якасьці фоташпалераў. Але нічога не атрымліваецца. Плякат вісіць надта ўжо высока. Надта высока...

Паказ фільму «Неба, самалёт, дзяўчына» адбыўся ў Менску амаль што адначасова з расейскай прэм'ерай. Стужка зьявілася рымэйкам (і хто толькі славей такіх напрыдумляў?) хіта шасьцідзясятых «Яшчэ раз пра каханьньне» з пышнацелай Даронінай і фізыкам Лазаравым у галоўных ролях. Гісторыя ўсім добра вядомая: каралева кабатажных авіярэйсаў кахае таўстаскурага насарога. Чмо бяздушнае паступова пачынае разумець, якое на яго абрынулася шчасьце, але позна - сьцюардэса гіне падчас няшчаснага выпадку.

Сьвежая вэрсія «Каханьня» нясе ў сабе шэраг хваробатворных бацыл «новага расейскага кіно»: на ўсіх ролях задзейнічаная цёплая кампанія сяброў па сумесных сьняданьнях у сушы-бары; выява месцамі папсаваная яркімі шанкрамі кліпавай цьвілі; да таго ж, у поўнай адпаведнасьці з канонамі галівудзкіх «псыхалягічных» фільмаў, рэжысэр выклікае бесьсьмяротны дух дзядулькі Фрэйда: у галоўнага героя прагрэсуе комплекс віны перад памерлай маці.

Вядучую мужчынскую ролю тэлежурналіста Георгія выканаў малады, але ня раньні актор Арлоў. Ужо пасьпеўшы засьвяціцца ў амплуа бандзюка ў некалькіх расейскіх баевіках (самы вядомы – «Брат-2»), спадар Арлоў ня вельмі турбуецца наконт стварэньня новага вобразу і працягвае граць крутога пацана па складзеным ўжо шаблёне, нават не адмыўшы крывавыя плямы з турэцкай скуранай курткі. Можа толькі крыху лоб нахмурыць, імітуючы складаную гаму пачуцьцяў, ды ў самы трагічны момант пашырэй зяпу разявіць. Так і чакаеш з экрану ўвесь час сакральнага пытаньня: «Братан, а это чё, Салтыкова? Салтыкова клёвая! Прёшь её?»

Яфрэмаў малодшы, пэўна паводле спадчыннага прызнаку, уляпаўся ў ролю няўдала ўлюбёнага першага пілота і поўнасьцю апраўдаў самыя дрэнныя прадчуваньні, упэўнена прадэманстраваўшы гледачам адутлаваты твар, мяшкі пад вачыма і няўцямную размову. Які там камандзір экіпажу! З такім фюзэляжам застаецца толькі гандляваць скрадзеным авіяцыйным палівам на шашы раённага прызначэньня. Пэўна, Яфрэмава зноўку не пусьцілі ў тэатар, і ён зьнянацку апынуўся на здымачнай пляцоўцы. Хоць і шкада чалавека, але падзялом: трэба было ў бацькі вучыцца правільна пахмяляцца!

Карацей, за усю кінагрупу прыйшлося аддувацца адной Рэнаце Літвінавай. І зрабіла яна гэта па-майстэрску, у адзіночку выцягнуўшы фільм. Твар сьцюардэсы Лары жыве на экране сваім асобным насычаным жыцьцём: на ім імгнення зьмяняюцца выразы страху, пяшчоты, разгубленасьці і турботы. Менавіта ў такой пасьлядоўнасьці і на працягу ўсяго толькі адной рэплікі, кшталту: «Я вам не скажу своё имя. Оно мне не нравится. Нет, пожалуй, скажу. Меня зовут Лара». Дадайце да гэтага непаўторную манеру размовы, жэстыкуляцыю іншаплянэцянкі – і вось перад вамі партрэт мілай сэрцу шызафрэнічкі з суседняга пад'езду. Прыём працуе бездакорна і выклікае стопрацэнтовы давер і спачуваньне да гераіні. Такое моцнае спачуваньне, што нават я, стары цынік, густ якога сапсаваны відэа-трэшам, прасьлязіўся падчас сцэны апошняга спадканьня Лары з тэлекан'юнктуршчыкам. Прасьлязіўся, хоць і ведаў з самага пачатку, што ўсё павінна скончыцца дрэнна. Брава, Рэната!

Разам са мной кіназалю пакідалі дзьве дзяўчыны. Яны паглядзелі стужку некалькі разоў і ў размове між сабой пераймалі інтанацыі Рэнаты. Паверылі. А можа ўсёж-такі ёсьць на сьвеце сапраўднае каханьне? Недзе высока-высока... ●



Вось так галоўная гераіня Рэнаты Літвінавай вырашыла зьвесьці рахункі з жыцьцём

ЛегЕнды

Ху із ху?

У «казе» «Менск» абвяшчаецца канцэрт «Акварыума» і Юры Шатунова. Праўда з інтэрвалам у 19 дзён. Акварыум выступае 1 траўня, а Юра – 19-га. Што ў іх агульнага? Грэбень пяе з 1973 года і ўсё пра незразумелае. Незразумелае сталася яўным. Усе грэбнеўскія фішкі ад Брайна Эіна з Дэйвам Бірнам да Марка Болана з калісьці забароненых пладоў ператварыліся ў прадукты замежнай папсы. Публіка хацела драйву. Замест драйву, як заўсёды, атрымала жвачку з поп-рок-х..ведае якіх кампанэнтаў. Канец 80-х мінулага стагодзьдзя прайшоў пад знакам «Маскавага Лаю» – сіроцкага калектыву, які бадзёра прачосваў правінцыйныя канцэртныя пляцоўкі са сваімі незамысловатымі песенькамі. Юра Шатуноў ашываўся ў каліфарнійскіх пабах для былых новых рускіх – новых амэрыканскіх і вырашыў урэшце наведаць месцы былых вялікіх касавых збораў «Белых ружаў». Грэбеншчыкоў, якога лёс ганяў то ў Амэрыку, то ў Гімалаі, вырашыў наведаць Менск, дзе, як відаць, толькі і засталіся апошнія заўзятары песьні «Пад небам залатым ёсьць Бора галубой». Калі-небудзь яны спаткаюцца ня толькі ў часе, але і ў прасторы і засьпяваюць дуэтам: «А в небе галубом всё травы да цветы – Белые розы! Белые Розы!»

КутОк спажыўцА

«Мальвіна» – амаль італьянскае віно

Самы падыходзячы напой для заліваньня тугі ў цяжкія часы, калі вас кінула любімая жанчына – дзяўчынка з блакітнымі валасамі. «Зьбяжала Мальвіна, нявеста мая, зьбяжала Мальвіна ў чужыя края...» Горкі смак напою нагадае вам пра шчасьлівыя часы, праведзеныя разам, і спыніць спажываньне «Мальвіны» вы зможаце хіба адключыўшыся. Галоўнае, ня верце таму, што напісана на этыкетцы – «віно пладовае асаблівае моцнае араматызаванае, выробленае з выкарыстаньнем канцэнтраванай асновы з травы зуброўкі» – гэта яўная хлусьня. Спосаб прыгатаваньня і склад «віна» трымаецца ў сакрэце, аднак нам удалося даведацца аб некаторых дэталях. Гэты кактэйль Молатава будзе грымець у вашым стаўніку і крыві так громка, як грымучая сумесь. Першае, што вам трэба зрабіць, каб самастойна зрабіць гэты напой – знайсьці тую дзяўчыну, якая дадумалася вас кінуць і вырваць яе паганыя вочы – яны заменяць вам пяць залатых. Закапайце іх Купальскай ноччу на полі, дзе будуецца Нацыянальная бібліятэка нашай Краіны Разумных. Таксама абавязкова ўкіньце ў ямінку тры скарынкі хлеба, пару стружак з носа Бураціны, тры валасы з барады Карабаса-Барабаса, сьлюні Артымона, што выдзяляюцца ў момант аргазму, перхаць папы Карла, падскуравы тлушч лісы Алісы і ката Базыліё, пару піявак Дурымара і самога Дурымара, і не забудзьцеся сказаць тры забытыя зараз словы (падказваем: «Рэкс, фэкс, пэкс»), і чакайце. Да прыходу будаўнікоў напой будзе гатовы. А дзе вы будзеце браць інгрыдыенты – вашая праблема, маленькія драўляныя дурачкі ●

Пінокіо, ВІНАДЗЕЛ



Гэтак архаічна выглядае напой італьянскай эпохі Адраджэньня, аднак, як вядома, з часам віно, як жанчына, набывае новыя магчымасьці

Аў-тара, аў-тара!



У Беларусі ўпершыню ўзбуджаная крымінальная справа аб парушэньні аўтарскіх, спажывецкіх, вынаходніцкіх і патэнтных правоў. Пракуратура Дзяржынскага міжраёну ўзбудзілася супраць фірмы «Чысты горад» за ўсталяваньне біяпрыбіральняў. «Шукец» невядомы. Мы выказваем незадавальненьне.Як так? Супраць чысьціні і нармальнага вызваленьня ва ўмовах апарожваньня страўніку выступае хто, мля? Патрабуем расьсьледаваньня. Хто гэты брудны замоўца. *Навінкі* сваё журналісцкае дасьледваньне ўжо пачалі. Магчыма гэта канфэцыйны...

1) Хутчэй за ўсё гэта брудная апазыцыя, якая мае за мэту паказаць цывілізаванаму грамадзтву ахвяру, у якім заняпадзе знаходзіцца нашая краіна, і якая патрабуе гуманітарнае дапамогі, так як на мяжы эканамічнага крызысу і бяз умяшальніцтва замежжа не абысьціся. «Аб'яднаньне беларускай шляхты» праз свой друкаваны ворган «Глос анархіста» пішуць, што Беларусь заўсёды трахалася ў хмызьняку цнот.

2) Замежная фірма «SIP», якой заела, што тэхналёгія адвядзеньня грошай за жэтон, які трэба кінуць у прамежнасьць дзеля таго, каб выкінуць зь сябе чарговае права пасраць альбо зьліць, калі і дзе пажадаеш.

3) Прафсаюз кіроўцаў аўтобусу № 100 (Акадэмія навук – Мінск-1), прадстаўнікоў якога задушыла жаба наконт зялёнага колеру. Відавочны ўплыў малахітавага зьмія.

4) Гарвыканкам станцыі «Койданава»: самыя паважаныя людзі горада падпісалі заяву на грант аб сваім «мястэчковым будаўніцтве», а тут абскакалі ●

НОвыя калябарАнты

ПітПаф, ой-ёй-ёй!

Пайшоў я ў мінулы аўторак папіць таннага піва на «Графіці» ў спадзяваньні на свабодны і халяўны ад усялякіх бардаў ды джазмэнаў дзень, ды жахліва абламаўся. Бо торкнула ж менавіта ў вольны дзень майго піўняка Піта Паўлава ў чарговы раз прэзэнтаваць там свой сольны праект PETE PAFF з новым альбомам. Карацей, піва спакойна папіць не давялося, а давялося слухаць фолькавыя патугі сэкс-сымбалю беларускай рок-сцэны, які гэтым ансамблем толькі ў «Графіці» і запрашаецца. Ня ведаю, ці прыперліся прысутныя таксама півам заліцца, альбо ў Піта сапраўды гэткія адданыя фанаты, аднак алькагольнае адзіноты не атрымалася, да соладахмелю з-за чаргі было не дарвацца. Спытаецеся, што ж я ўсё пра калдырства – дык музыка адпавядала настою. Гэта, вядома, не запойная «Крамбамбуля», аднак народная творчасьць бабулек, скрадзеная Пітам з патэнцыйнага рэпэртуара KRIWI, навявае непазбыўнае жаданьне заліць у сваю ненасытную глотку што-небудзь крапчэйшае за 69,9 градусаў з удзячнай бабульчынай трубачкі. «Дзеўкі, цёлкі, пацукі» – сакрэт патэнцыйнае папулярнасьці праекта ПІТ ПАФ, – калядныя, вясельныя, кахальныя, юр'еўскія, жалобныя і прочыя традыцыйныя беларускія загоны, якія ад гнілі й ратуюць толькі такія ВІА. Толькі вось іншаземных наведнікаў канцэрту магло абразіць тое, што спадар Паўлаў прысвоў адкрыцьцё ўсіх традыцыйных народных ірляндзкіх, чукоцкіх, армянскіх і іншых інструмантаў беларусам. Хто хоча перакanaцца ва ўсім вышэйнапісаным могуць прыйсьці на сольны, амальхатні канцэрт PETE PAFF 2 траўня ў 19.00 на філфак (К. Маркса, 31) і адарваць ад душы акрамя 3 тыщч яшчэ й бабульчыны запавеы ды завінціць іх у мозгі.

Як адцягнуцца...

Па-карлсанску

Як зьезд КПСС, як чарговая сэлектарная нарада, як штогадовыя Дажынкі... Усе гэтыя традыцыі меркнуць перад склярознай звычкай беларускага народу кожны красавік слухаць жыўцом альбом **НЕЙРО ДЮБЕЛЯ** пад назвай **ПИОТКУКУК**. Гэтым разам культавае мерапрыемства адбудзецца у **«Рэактары» (17.04/19:00)**. Традыцыйны сэйшн ня ўдалося сарваць нават Міністэрству Абароны – адмыслова пад канцэрт гітарыста Громава выкінулі нахрэн з шэрагаў узброеных сілаў РБ.

Па-ленінску

Беларускія авангардысты адзначаюць 133 гадавіну з дня нараджэньня таварыша Леніна урачыста – **23.04 у ДК «Юнацтва» адчыняецца фэст «Нефармат-3»** з удзелам **НАГУАЛЬ, СОЛНЦЕ-ЦВЕТЫ, PRAS, KRITCHEV VS. BAN**, а таксама вядомага алкаголіка і тунеядца Зьміцера Вішнёва разам з Алесем Пушкіным.

Па-мэтрастроеўску

У Менск прывозяць мажорскі **мюзыкл «Мэтро»**. Калі б яго паказвалі ня **29.04-1.05 (саркафаг рэспублікі, 19:00)** а роўна месяцам пазьней, я б сказаў, што ён прысьвечаны чацьвертай гадавіне нямiскай давілаўкі. А так і наехаць няма за што....

Па-шматтанажнаму

13 красавіка ў пантовай забягалаўцы **«РЭАКТАР»** пражужжыць першая частка прэзэнтацыі зборніка беларускамоўнага поп-металу ад БМА **«Hard Life-Heavy Music-2» з удзелам гуртоў: MORBID VICTORY, AQUAMORTA, DEADMARSH, ARIZONA, THE REGENT (праект вакаліста GODS TOWER), PARTYZONE, NECROMANT, SUFFERER, GLOOM ART, VIR. Пачатак 18:00**. Кошт квітка пры папярэднім продажы 6500 (танцпол), 8000 (за столікам), у дзень канцэрта 7500 (танцпол).

Па-кіношнаму

Пакуль масавы піпл лыбіцца на **«Таксі-3» («Мір», «Аўрора»)** і оскарных **«Фрыду» («Бярэсьце, «Пабеда»)**, **«Чыкага» («Масква», «Кастрычнік»)** ды **«Валадар пярсьцёнкаў. Вежы-блізьняты» («Партызан»)** сапраўдныя кінамажоры цягнуць свае косткі на «Кінафармат 4x4». Гэтым разам КФ4x4 пройдзе **з 17.04 па 20.04** і будзе ўключаць у сябе кіношкі **«Экспэрымэнт»** (Нямеччына, турэмна-сацыяльны брутал), **«Чалавек безь мінулага»** (Фінляндыя – Францыя – Нямеччына, банальны трылерок), **«Жыцьцё запаветнае»** (Францыя, больш нічога не вядома) ды **«SOS»** (Нарвэгія – Італія, парнушная камэдыя). Месцы праходу КФ4x4 удакладняюцца. Прыемнага адцягу!!!

Па соцрэалізму


Тодара Вайцюшкевіча зь яго WZ-Orkiestra канчаткова торкнула (будуць сьпяваць кавэры на вершы Маякоўскага), і тыя, хто гэта ў стане вытрымаць -- падыходзьце 22 красавіка а 20.00 на Графіці, але лепш пасьпець замовіць квіткі (а іх усяго 50) у арганізатараў па нумары 80296715865, мо пасьпееце.

Санітар, культурны футуроляг

P.S. Зьлівайце свае анонсы на ***sanitar@tut.by*** *альбо на пагер* ***2070000 аб. 6589669***

Старыя хіпаны ў Новым клюбе

Перамога пацыфізму вайсковымі мэтодамі



Я заўсёды ставіўся да хіпі з падазронасьцю: калі хіпі ветліва пасьмяхаецца і лечыць на тэму «Ўсё, што табе патрэбна – гэта каханьне», так і ведай: зараз пачне клянчыць грошы ці страляць цыгарэты. Але сустракаюцца і сярод хіпі добрыя людзі.

На мінулым тыдні шырока вядомая ў хіпоўскіх колах сьпявачка Умка са сваім гуртом «Браневічок» упершыню ў жыцьці наведала з канцэртам наш зусім не любвеабільны горад.

За паўгадзіны да канцэрту «Новы клюб» стаў падобны да падмосткаў брадвэйскага мюзыклу «Валасы»: кудлатыя дзявіцы бадзяліся па зале, чапляліся фенечкамі за абстаноўку і наступалі адна адной на кляшы. Усьлед за сваімі Джэніс Джоплінамі прыцягнулася і некалькі змрочных акулярыстых Джымаў Морысанаў. Адно слова – філёлагі.

Сэйшн адкрыў менскі гурт СОНЦА. КВЕТКІ. Як сьпявае Умка: «На кожнай лініі ёсць станцыя Пісьцец». Відавочна, СОНЦА. КВЕТКІ на сваім творчым шляху дабраліся да той станцыі. Добра, што хлопцы нядоўга дэманстравалі слухачам свае навыкі ў вобласьці гукавылучэньня і саступілі сцэну больш кваліфікаваным маскоўскім гасьцям.

Умкін-бэнд за паўтары гадзіны з уздымам адлабаў славутыя хіты: «Па каханьню», «Керуак – трапло», «Паглядзі на сябе» і яшчэ з два дзясятка нумароў. Музыкі парадавалі добрай зыгранасьцю, і нават гукарэжысэр «Новага клюбу», які дрэнна выставіў нізкія частоты, не змог сапсаваць майго добрага ўражаньньня ад канцэрту. І слухачоў, і выканаўцаў пёрла, і зусім не ад ганджубасу, як сцьвярджалі некаторыя злыя языкі.

Раней я лічыў, што Умку клічуць Умкай за тое, што яна вумная.

Але аказалася, што сьпявачка сваёй новай фрэзурай «восень у Бухенвальдзе» і гарэзліва тырчачымі вушкамі сапраўды нагадвае мульцяшнага медзьведзяня. Такі вось іміжд. Затое галасішча, галасішча! Да пячонак прабірае.

Умке не ўласьцівы «прыемны» тэмбр. Яе голас можа здацца нават занадта рэзкім для аматараў шапялява-сюсюкаючай папсы. Голас-канфлікт. Да таго ж вуглаватая постаць сьпявачкі з засунутымі ў кішэні кулакамі дапаўняе партрэт асобы, якая знаходзіцца ў пэрманэнтных контрах з акружаючым сусьветам.

Галоўным у Умкіных песьнях безумоўна зьяўляецца тэкст.

Адчуваецца, што за вершамі стаіць сур'ёзная праца. Так можа пісаць толькі чалавек, які прафэсійна валодае законамі вершаскладаньня і добра адчувае музычны рытм. Амаль бездакорныя па форме, вершы Умкі прасякнутыя ваяўнічым гуманізмам, заснаваным на глыбокім жыцьцёвым досьведзе. Як вам, напрыклад, падабаецца такі пасаж: «Калі б я была гарматай, я б страляла толькі цыгарэты» (во-во, я ж пра тое і кажу).

Карацей, творчасьць Умкі, як звычайна кажуць карэспандэнты беларускага радыё, не пакінула мяне абыякавым. На прыканцы выступу Умка заклікала не праходзіць міма ляжачага на сьнезе чалавека, і я так прасякнуўся гэтай ідэяй, што потым некалькі дзён хадзіў па горадзе і падымаў усіх ляжачых. Пры гэтым мяне супакойвала адна думка: Умцы ў Маскве рабіць гэта значна цяжэй. А калі яшчэ і на вакзал зайсці... ●

Хіпаны, хіпаны

МузабсОс

Красавіцкія тэзысы Умкі без Браневічка




Ну, ніхто спрачацца ня будзе – Умка, вядома, супэр: і ў нашую славянскую сталіцу нарэшце (упершыню) даехала, і канцэрт у наваpочаным клюбе NC замарочыла (дзякуй арганізатарам – Арчы ды Стасу), і яшчэ праз нейкі час заехаць абяцалася. Вось толькі панты і хіпоўскае выхаваньне не далі ёй толкам паразмаўляць з карэспандэнтам *Навінак*, хоць папярэдняя дамоўленасьць і была. Адзінае, што з імпэтам, быццам цыганка, патрабавала Аня Герасімава, гэта «набудзь мае дыскі, усяго па пяць тысяч». Але адкуль жа ў чэснага журналіста такія грошы, ужо думалася, што і ад адной з апошніх хіпей халявы не дачакаесься. Аднак, у выніку квяцістае мінулае ўзяло верх у душы Ўмкі, і яна памяняла на два нумары *Навінак* два сваіх дыскі, і тое, адзін трохгадовай даўніны, які мы пакінем без увагі. А вось апошнюю плытку 2003 года «Live без ансамбля» прышчучым. Вымушаны канстатаваць: сьпісалася Умка! Калі на канцэрце яшчэ шчасьціць адчуць свае патлы канца шасьцідзесятых і ўзмахнуць фенечкамі, быццам Царэўна-лягушка, каб ажно лебядзі белыя праз натоўп пашчаміліся, дык на гэным кампакце зь мярцьвячым лічбавым гукам губляецца амаль усё. І жывы гук не дапамагае, хоць і запісана ўсё было ў маскоўскім клюбе «Фарпост», і ансамбль згубіўся недзе па дарозе, толькі Умка зь гітараю, быццам эўраазіяцкая Торы Амас. Аднак былога псыханутага імпэту, як і былых валасоў – няма. Каробіць і тое, што легенда хіпаноў Арбату ня здолела нават выдаць сольны альбом – першую палову дыску займае альбом нейкага Эрыка з малазразумелымі тэкстамі пра «добрага маргінала» ды ліфцёра. І толькі ў другой палове дыску мы чуем нібыта «новы жывы альбом» Умкі, дзе й новых та песьняў – на пальцах адной нагі пералічыць можна. Адзінае, што ратуе плытку ад правалу, дык гэта сама Умка – яна і варожыць, і забівае, голас аднaчасова і перадаргазмены, і антысэксісцкі, дзявочы і перадсьмяротны, плакальшчыцы і цыніка, ну а тэксты – як заўсёды: я ня я, і эсхаталёгія не мая. Дзяўчынка з барадой расьціць яе й надалей. З улікам таго, што «все права якобы защищены», зьвяртайцеся ў рэдакцыю па пірацкія копіі. Сустрэнемся на Арбаце ●



Параўнайце дзьве фоткі і зрабіце выснову: лысай Умцы, відаць, няма чаго сказаць заклапочаным хіпанам, хіба тусавацца з незразумелымі Эрыкамі

Джэніс Джоплін, канкурэнтка



Апошняе фота Садама Хусэйна, яшчэ не паруганае амэрыканцамі.